Сямейная газета

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

27 КАСТРЫЧНІКА 2016 г. ЧАЦВЕР № 208 (28318)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



## Хуткае чытанне: шкода ці карысць?



## Гістарычнае падарожжа ў рытме вальса



## Вёска ў цэнтры сталіцы

СТАР. 13

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Алег ТОКУН, начальнік упраўлення палітыкі занятасці Міністэрства працы і сацыяльнай абароны:**

*«Намі распрацаваны праект указа аб павышэнні памеру дапамогі па беспрацоўі, ён падтрыманы Мінэканомікі і Мінфінам і цяпер знаходзіцца ва ўрадзе. Дакумент прадугледжвае павышэнне памеру дапамогі па беспрацоўі для двух катэгорый беспрацоўных. Першая — гэта тыя, хто звольнены ў сувязі са скарачэннем колькасці, штату работнікаў або ліквідацыяй прадпрыемства. Мы прапануем плаціць такім беспрацоўным дапамогу па беспрацоўі ў памеры 100% бюджэту пражытачнага мінімуму. Другая катэгорыя — гэта тыя, хто звольнены па ўважлівых прычынах, напрыклад, у сувязі са сканчэннем тэрміну кантракта. Такім беспрацоўным дапамогу па беспрацоўі прапануецца ўстанавіць у памеры 50% бюджэту пражытачнага мінімуму».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 27.10.2016 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 1,9017 ▲ |
| Еўра | 2,0744 ▲ |
| Рас. руб. | 0,0305 ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0743 ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# МАЛЯВАЦЬ СВАЮ ГІСТОРЫЮ




Выпускніца Мірскага прафесіянальна-тэхнічнага каледжа па спецыяльнасці «Мастак роспісу па дрэве» Таццяна НОВІКАВА дапамагае афармляць новую аграсядзібу «Мірскі падворак». Мастачка малюе карту гасцявога пакоя разам з гістарычнымі і культурнымі маршрутамі, якія даюць турыстам уяўленне пра нязведаную і таямнічую краіну Беларусь.
***На фота:*** **побач з мастачкай знаходзіцца і гаспадар аграсядзібы Пётр НАРБУТОВІЧ.**

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Пра навуку — папулярна

# ДРУК УЖО НЕ ТОЙ

## 3D-прынтары адкрываюць новыя магчымасці

**Большасць з нас у сваім жыцці сутыкалася з выхадам са строю рознага кшталту бытавой тэхнікі. Увявіце сабе, што замест таго, каб несці ўмоўны мабільны тэлефон у рамонт, вы проста заходзіце на сайт вытворцы, скачваеце спецыяльны файл і... друкуеце зламаны корпус ці электронную схему на дамашнім 3D-прынтары. Зрэшты, у перспектыве гэта можна будзе рабіць не толькі з тэхнікай — арганізм чалавека таксама мае прыкрую ўласцівасць «выходзіць са строю», і магчымасць надрукаваць для яго запасную «дэталь» можа змяніць свет. Думаеце, усё гэта справа далёкай будучыні? Так званыя адытыўныя тэхналогіі развіваюцца з неверагоднай хуткасцю, і Беларусь не застаецца ў баку ад гэтага працэсу. Мы наведалі Інстытут цепла- і масаабмену імя Лыкава Нацыянальнай акадэміі навук і даведаліся, як развіваецца 3D-друк у нашай краіне.**

СТАР. 4



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

■ Актуальна

# ГЭТЫ ЗБОР НЕ КУСАЕЦЦА

## Аднак уласнікі дамоў, кватэр і зямлі павінны да 15 лістапада разлічыцца з бюджэтам па маёмасных падатках

**Ужо традыцыйна кожную восень да сярэдзіны лістапада беларусы павінны заплаціць падатак на нерухомасць і зямельны падатак. Разам з падатковай службай мы паспрабуем разабрацца з тым, каму ў бліжэйшыя два тыдні неабходна будзе паспець заплаціць гэты збор.**

### ПРА ВАС НЕ ЗАБУДУЦЦА

Звычайна падатковая інспекцыя рассылае сваім кліентам адпаведныя паведамленні на аплату маёмасных падаткаў да 1 чэрвеня. Атрымліваюць людзі гэтыя апавяшчэнні заказнымі лістамі. Там прапісваюцца ўсе неабходныя банкаўскія рэквізіты і сума падатку. Чалавеку застаецца толькі не згубіць гэтую паперку і адшукаць грошы. Але калі па нейкіх прычынах ліст ад падатковай вы не атрымалі, гэта зусім не азначае, што ад аплаты вызваляецеся аўтаматычна, бо пра вас забыліся. Проста ў наступным годзе трэба будзе заплаціць такі падатак ужо за два гады. Паведамленне на аплату маёмаснага падатку можа дайсці да адрасата і пасля 15 лістапада. У гэтым выпадку ўласніку нерухомасці неабходна будзе разлічыцца з казной на працягу 30 дзён пасля атрымання адпаведнай паперы.

### ПАДАТКОВАЯ ЛЬГОТА — ТОЛЬКІ НА АДНУ КВАТЭРУ

Паводле падатковага заканадаўства грамадзяне, у якіх ва ўласнасці адна кватэра, поўнасцю вызваляюцца ад аплаты падатку на нерухомасць у дачыненні да гэтай маёмасці. Захаваецца льгота і ў тым выпадку, калі ў сям'і дзве кватэры, але адна, напрыклад, афармлена на мужа, а другая — на жонку.

Зробім нашага патэнцыйнага падаткаплацельшчыка крыху багацейшым і ўявім, што ў яго ёсць не толькі кватэра, але і домік у вёсцы. За кватэру і ў гэтым выпадку падатку не будзе, а вось за домік у вёсцы (а таксама і за зямельны ўчастак, на якім ён размешчаны) прыйдзецца плаціць. Суму падатку падлічвае непасрэдна падатковы орган. Памер яе залежыць ад кадастравага кошту зямлі, канкрэтнага адрасата нерухомасці, размяшчэння ўчастка ў тым ці іншым жыллёвым масіве, ад якасці дарог, наяўнасці сацыяльнай інфраструктуры і гэтак далей. Атрымліваецца, што ў розных абласцях і раёнах маёмасны падатак будзе адрозніваецца. Звычайна тут працуе такі алгарытм — абавязкова нерухомасць істотна даражэе ў тым выпадку, калі яна бліжэй да нейкага буйнага адміністрацыйнага цэнтра.

СТАР. 4

■ Антыалкагольныя меры

# БЮДЖЭТ ТОЛЬКІ ВЫЙГРАЕ!

**Да 1 лістапада ў Савет Міністраў будзе ўнесены праект указа «Аб асобных пытаннях рэгулявання рознічнага гандлю алкагольнымі, слабаалкагольнымі напоямі і півам». Чарговым этапам зніжэння даступнасці такога тавару абурэецца гандаль, які запэўнівае грамадства ў абавязковых дзяржаўных стратах, калі прапанаваныя меры будуць прыняты.**

Дзевяць літраў абсалютнага алкаголю ў год прыпадае ў нашай краіне на душу насельніцтва, а паводле звестак Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, і пры васьмі ўжо можна весці размову аб дэградацыі грамадства. Першая лічба не так даўно была яшчэ вышэйшая.

Дзякуючы існуючым абмежавальным мерам — забароне ўжывання піва і слабаалкагольных напояў у грамадскіх месцах, наданню мясцовым органам улады права абмяжоўваць месца і час продажу, — удалося дасягнуць зніжэння на працягу года на 5 працэнтаў колькасці пастаўленых на ўлік у наркадыспансерах, змяншэння выпадкаў алкагольных псіхозаў, а таксама зафіксаваць менш злачынстваў, учыненых у стане алкагольнага ап'янення.

«Аднак сітуацыя застаецца складанай, бо ў агульнай структуры злачыннасці па-ранейшаму кожнае чацвёртае злачынства і кожнае трэцяе цяжкае злачынства ўчыняюцца ў п'яным стане, — адзначае **намеснік начальніка ўпраўлення прафілактыкі галоўнага ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі міліцыі грамадскай бяспекі Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь Сяргей КРАСУЦКІ.** — Алкаголь у свядомасці нашых грамадзян прыроўнены ўжо да прадуктаў харчавання. Ён знаходзіцца ў крамах побач з хлебам, малаком і цукеркамі. Мы вырошчваем пакаленне, якое ўспрымае алкаголь не як штосьці забароненае, а як штосьці нармальнае і неабходнае... Калі мы наогул не прададзім ніводнай бутэлькі спіртнога, дзяржава толькі павысіць свой даход!»

Праведзеныя ў нас і за мяжой даследаванні паказваюць, што даходы, атрыманыя ад такога гандлю, у два разы меншыя за тыя расходы, якія дзяржава атрымлівае ў выніку спажывання напояў з градусам. Новы нарматыўна-прававы акт вызначае пазіцыі, прадугледжаныя дзяржпраграмай «Здароўе народа» і Дырэктывай №1, якія маюць на ўвазе паэтапнае зніжэнне спажывання алкаголю насельніцтвам. Цяпер прадугледжваецца забарона рэалізацыі алкагольных напояў з 22.00 да 9.00 (або начны гандаль), а таксама забарона гандлю там, дзе для гэтага адсутнічаюць асобныя аддзелы (пакуль толькі для тых гандлёвых арганізацый, плошча якіх большая за 400 кв. м, аднак пазней плануецца пашырыць забаронную практыку і для іншых крам).

А вось спробы гандлёвага лобі прыпыніць гэты працэс нічога не вартыя. Іх асноўны аргумент пра «дзірку» ў бюджэце — проста падмена разуменняў. У сапраўднасці могуць упасці даходы толькі канкрэтных гандлёвых крам і сетак. А што павінна страціць дзяржава, калі чалавек патраціць «алкагольныя» грошы на любыя іншыя тавары?

**Святлана БАРЫСЕНКА.**
*protas@zviazda.by*

■

■ Грошы

## Банкамат вялікіх літар




**Адзін з сістэмных банкаў краіны правёў адаптацыю сваіх асобных банкаматаў для людзей з аслабленым зрокам**

**Гэта было зроблена фінансавай установай для павышэння даступнасці фінансавых паслуг для ўсіх катэгорый насельніцтва. Для пераводу такіх банкаўскіх прылад самаабслугоўвання ў рэжым «вялікіх літар» неабходна выбраць «Спецрэжым» на экране выбару мовы пасля ўстаўкі карткі ў картпрыёмнік. Цяпер у гэтым рэжыме сталі даступнымі аперацыі зняцця наяўных, прагляду балансу і міні-выпіскі.**

Акрамя спецыяльнага інтэрфейса, у такіх банкаматах цяпер рэалізавана магчымасць гукавога суправаджэння дзеянняў кліентаў з дапамогай навушнікаў. Гэтай восенню банкаматы з падобным сэрвісам дзейнічаюць у Мінску, Магілёве, Гродне, Віцебску, Мазыры, Лідзе і Гомелі. Актуальныя адрасы банкаматаў з магчымасцю выбару спецрэжыму размешчаны на стэндах банкаў і на старонках іх сайтаў у інтэрнэце.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Меркаванне

# АФРЫКАНСКІЯ ПЕРСПЕКТЫВЫ: ЦЯЖКАСЦІ І ДАСЯГНЕННІ



**Днямі міністр замежных спраў нашай краіны Уладзімір Макей па выніках перамоў з намеснікам прэм'ер-міністра — міністрам міжнародных адносін і супрацоўніцтва Намібіі Нетумба Нандзі-Ндаітвай заявіў, што Беларусь разлічвае павялічыць аб'ём таваразвароту з краінамі Афрыкі. Як цяпер развіваецца Афрыка і якія праблемы стаяць перад Беларуссю на гэтым шляху?**

Насельніцтва Афрыкі перавысіла па выніках 2015 года адзін мільярд жыхароў. Кожны год кантынент прырастае 25—27 мільёнамі. Пры гэтым эканамічнае развіццё Афрыкі пакідае жадаць лепшага. 65 працэнтаў рабочых месцаў на кантыненце створана ў сферы сельскай гаспадаркі. Падобная сітуацыя была ў многіх еўрапейскіх краінах сто гадоў таму, што наглядна сведчыць аб эканамічнай адсталасці кантынента. У наяўнасці і сур'ёзныя праблемы ў медыцыне. Калі ў Беларусі смерць парадзіхі ўспрымаецца як надзвычайнае здарэнне нацыянальнага маштабу і адбываецца вельмі рэдка, то ў Афрыцы гэта ўсё яшчэ штодзённасць — на 190 родаў прыпадае адна смерць парадзіхі. Ёсць адставанне ў адукацыі. Пісьменнымі з'яўляюцца толькі 66 працэнтаў маладых дзяўчат і 76 працэнтаў хлопцаў. Рэсурсамі інтэрнэту карыстаецца толькі 22 працэнты жыхароў кантынента. Таксама больш чым палова насельніцтва пазбаўлена доступу да электрычнасці.

Найбольшую цікавасць у Афрыцы прадстаўляюць велізарныя запасы карысных рэсурсаў на яе тэрыторыі, частка якіх ужо знаходзіцца ў распрацоўцы. Так, у сусветным рэйтынгу па вытворчасці нафты Нігерыя стаіць на 13 месцы, Ангола — на 16-м, Егіпет — на 27-м, а Лівія — на 30 месцы. У вытворчасці газу Алжыр знаходзіцца на 7 месцы, Лівія — на 14-м. Па здабычы вугалю ПАР знаходзіцца на 7 месцы, а Мазамбік — на 28-м. У сусветных рэйтынгах па здабычы золата ПАР займае 7 месца з 140 тонамі ў 2015 годзе, а Гана — 10-е з 85 тонамі здабычы. Таксама на кантыненце здабываюцца алюміній і медзь, алмазы, уран, а таксама іншыя каштоўныя рэсурсы.

Беларусь мае дыпламатычныя адносіны з 48 з 54 краін Афрыкі. Адной з галоўных праблем у развіцці адносін з'яўляецца няздольнасць афрыканскіх дзяржаў фінансаваць утрыманне пасольстваў у краінах, падобных па памеры насельніцтва на Беларусь, што абцяжарвае ўзаемадзеянне ў розных сферах. Пераважная большасць паслоў афрыканскіх дзяржаў акрэдытавана ў Беларусі па сумяшчальніцтве, і яны досыць рэдка з'яўляюцца на нашай тэрыторыі. З свайго боку чаргу беларускія пасольствы мы можам трымаць толькі ў краінах, якія з'яўляюцца самымі важнымі партнёрамі. Яны функцыянуюць у Егіпце, Нігерыі, Эфіопіі і ПАР. Палепшыць узаемадзеянне дапамагае інстытут ганаровых консулаў Беларусі. Яны на цяперашні момант прадстаўляюць Беларусь у Гане, Нігерыі і Судане. Таксама падтрымліваць і развіваць адносіны з краінамі кантынента дапамагае статус назіральніка ў самых важных арганізацыях — Афрыканскім саюзе і Лізе арабскіх дзяржаў.

Важнай задачай з'яўляецца нарошчванне таваразвароту з краінамі Афрыкі, перш за ўсё, беларускага экспарту. Па асобных дзяржавах рэгіёна за 2015 год удалося дасягнуць істотных поспехаў. Так, беларускі экспарт у Анголу ўзрос у шэсць разоў (да 31,2 мільёна долараў), у Камерун — у два разы (да 8,5 мільёна долараў), у Кот-д'Івуар і Судан — у паўтара раза (да 23,6 мільёна долараў і 41,4 мільёна). На жаль, рэзка знізіўся экспарт у ПАР, Уганду, Кенію і Егіпет.

Росту беларускага экспарту ў афрыканскія краіны перашкаджае рэзкае зніжэнне тэмпаў эканамічнага развіцця кантынента ў апошнія гады — калі ў 2014 годзе ён складаў 4,5 працэнта, то па выніках 2015 года знізіўся да 3 працэнтаў, а па выніках 2016 года чакаецца не больш за 2,5 працэнта. Негатыўную ролю адыгрывае таксама неабходнасць везці беларускія тавары і камплектуючыя некалькі тысяч кіламетраў да бліжэйшай афрыканскай краіны. Акрамя гэтага, многія жыхары проста па сваіх даходах не могуць дазволіць сабе купляць імпартныя беларускія тавары. Так, па самых апошніх звестках, колькасць афрыканцаў, якія жывуць менш чым на 1,9 долара ў дзень, дасягае 42,7 працэнта насельніцтва. У Беларусі, як і ў Еўропе і Паўночнай Амерыцы, з-за ўласцівых рэгіёну высокіх выдаткаў, цяжка вырабляць танныя тавары, якія будуць па кішэні досыць бедным людзям. У выніку на афрыканскім рынку робіць усё большыя поспехі Кітай, які выпускае танныя тавары велізарнымі партыямі спецыяльна пад рынкі з нізкай пакупной здольнасцю насельніцтва ва ўсім свеце.

Зыходзячы з гэтых фактараў, прымальнай формай для развіцця таваразвароту з'яўляецца стварэнне зборачных цэхаў буйных беларускіх экспарцёраў на тэрыторыі афрыканскіх краін. Лідарамі ў гэтым напрамку выступаюць МТЗ і МАЗ. Здабыча прыродных рэсурсаў на тэрыторыі Афрыкі таксама паслужыла б развіццю таваразвароту, але ад гэтых планаў пакуль што даводзіцца адмаўляцца праз адсутнасць патрэбных вялікіх укладанняў.

**Сяргей КІЗІМА,**
**доктар палітычных навук**

■

■ Занятасць

# БУДУЧЫЯ ЦЫРУЛЬНІКІ І МАЛЯРЫ

**Моладзі без вопыту працы прапануюць асвойваць рабочыя прафесіі**

**З пачатку года на вучнёўскія месцы ў рамках праграмы «Маладзёжная практыка» ўладкавана паўтысячы беспрацоўных выпускнікоў. Большасць з іх — па рабочых спецыяльнасцях.**

У Міністэрстве працы і сацабароны адзначаюць, што «Маладзёжная практыка» дапамагае выпускнікам набыць уменні і навыкі работы непасрэдна на вытворчасці, павысіць сваю канкурэнтаздольнасць. Гэта асабліва актуальна для тых, хто скончыў каледж ці ўніверсітэт і не атрымаў месца па размеркаванні. Цяпер, дарэчы, у праграме могуць удзельнічаць і маладыя маці, якія доўгі час не працавалі ў сувязі з доглядам за дзіцем да трох гадоў.

Тэрмін праходжання практыкі — шэсць месяцаў для жыхароў сельскай мясцовасці, а для малых гарадоў — год. Наймальнікам, што прымаюць выпускнікоў на вучнёўскія месцы, часткова кампенсуюць выдаткі на аплату іх працы — у памеры мінімальнага заробку (гэта каля 240 рублёў) і абавязковых страхавых узносаў. Перавагу аддаюць тым прадпрыемствам, якія гатовы ў будучым уладкаваць навічкоў на пастаяннай аснове. Летась, напрыклад, 43 працэнты хлопцаў і дзяўчат пасля праходжання «Маладзёжнай практыкі» замацаваліся на працоўных месцах.

Акрамя гэтага, сёлета ў студзені-верасні 27,6 тысячы школьнікаў і студэнтаў былі часова ўладкаваны ў свабодны ад вучобы час і на летнія канікулы. У асноўным хлопцы і дзяўчаты выконвалі рамонтна-будаўнічыя работы ў класах і аўдыторыях, выраблялі цацкі і сувеніры, азеляняли і добраўпарадкавалі тэрыторыю, вырошчвалі гародніну.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

## ЗВАНКІ-ПАМОЧНІКІ

Як і раней, па суботах, на сувязі з насельніцтвам 29 кастрычніка — Мінскі гарадскі і абласны выканаўчыя камітэты. Час работы застаецца нязменным — звярнуцца з просьбай або прапанова́й наўпрост да прадстаўніка ўлады можна з 9 гадзін раніцы і да паўдня.

Тэлефонныя лініі ў краіне сталі рэгулярнымі ў пачатку мінулага года. За гэты час магчымасцю вырашыць праблемныя пытанні аператыўна і без залішняй папяровай валакіты скарысталіся многія беларусы.

**На тэлефонныя званкі ў гэтую суботу, 29 кастрычніка, будуць адказваць:**

**Брэсцкі аблвыканкам**
першы намеснік ТОКАР Мікалай Васільевіч (80162213121);

**Віцебскі аблвыканкам**
першы намеснік старшыні ГРАБНЁЎ Генадзь Іванавіч (80212222222);

**Гомельскі аблвыканкам**
намеснік старшыні ПРЫВАЛАЎ Уладзімір Аляксандравіч (80232751237);

**Гродзенскі аблвыканкам**
старшыня абласнога Савета дэпутатаў ЖУК Ігар Георгіевіч (80152735644);

**Магілёўскі аблвыканкам**
кіраўнік спраў ВАРОНІН Рыгор Аляксандравіч (80222501869);

**Мінскі аблвыканкам**
намеснік старшыні НЕЎМЯРЖЫЦКІ Сяргей Пятровіч (80175004160);

**Мінскі гарвыканкам**
намеснік старшыні ЛАПЦЕЎ Віктар Сяргеевіч (80172224444).


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТЫХ АУКЦИОНОВ

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г.Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 42-61-62.

**Продавец:** ОАО «Витебские продукты», 210041, г. Витебск, ул. Воинов-Интернационалистов, 25, тел. +375 29 711-18-95.

| |
|---|
| Лот №1. Капитальное строение с инв.№200/С-53085 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Терешковой, д.14А, площадью 957,5 кв.м, наименование: здание магазина, расположенное на земельном участке с кадастровым № 240100000001000491 площадью 0,1972 га; капитальное строение с инв. № 200/С-96572 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Терешковой, хозяйственно-бытовая канализационная сеть от здания 14А, протяженность – 64,8 метра, наименование: хозяйственно-бытовая канализационная сеть. Нач. цена (с учетом/до деноминации): 415 588,94/4 155 889 400 бел. руб. без НДС. Задаток (с учетом/до деноминации): 41 558,89/415 588 900 бел. руб. |
| Лот №2. Изолированное помещение с инв.№200/D-94455 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Московский, д.64 площадью 1213,1 кв.м, наименование: магазин, назначение: торговое помещение. Нач. цена (с учетом/до деноминации): 874 880/8 748 800 000 бел. руб. без НДС. Задаток (с учетом/до деноминации): 87488/874 880 000 бел. руб. |
| Лот №3. Изолированное помещение с инв.№200/D-92048 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Пролетарская 1-я, д.10 площадью 1154,9 кв.м, наименование: столовая, назначение: помещение общественного питания. Нач. цена (с учетом/до деноминации): 81 264,45/812 644 500 бел. руб. без НДС. Задаток (с учетом/до деноминации): 8 126,45/81 264 500 бел. руб. |
| Повторный аукцион состоится 11.11.2016 в 11.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и приема документов: с 27.10.2016 с 8.30 по 10.11.2016 до 17.30. Срок заключения договора купли-продажи: 10 календарных дней со дня проведения аукциона. Условие аукциона: оплатить предмет аукциона в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи, оплатить НДС сверх цены продажи объекта, возместить затраты на организацию и проведение аукциона и затраты по оценке имущества. Ранее опубликованные извещения: газета «Звязда» 10.09.2016, 27.08.2016. |

**Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д.5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Аукцион проводится в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609. Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица РБ – доверенность (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – документ, подтверждающий его полномочия. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) обязан перечислить затраты на организацию и проведение аукциона, возместить затраты по оценке имущества на расчетный счет, указанный в протоколе аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. **Задаток перечисляется на р/с 3012078870010, ЦБУ № 2 ЗАО «МТБанк», г. Витебск, ул. Ленина, 17, БИК 153001117, УНП 390477566, получатель платежа – ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. Дополнительную информацию можно получить по тел.: (0212) 42-61-62, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by.

■ Запрашаем выказацца

# Зрабіць эканоміку экалагічнай

**Грамадскія абмеркаванні праекта Нацыянальнага плана дзеянняў па ўкараненні прынцыпаў зялёнай эканомікі праходзяць у краіне**

**Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя да 4 лістапада 2016 года праводзіць грамадскія абмеркаванні праекта Нацыянальнага плана дзеянняў па ўкараненні прынцыпаў зялёнай эканомікі ў галінах народнай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь да 2020 года.**

***Свае заўвагі і прапановы па праекце прадстаўнікі грамадскасці могуць дасылаць па электроннай пошце an_work@minpriroda.gov.by ці ў пісьмовым выглядзе на адрас: 220004, г. Мінск, вул. Калектарная, 10, кабінет 107. Дакументы для разгляду размешчаны на старонцы афіцыйнага сайта Мінпрыроды http://minpriroda.gov.by/ru/plan/.***

Стратэгічная мэта дакумента, распрацаванага Мінпрыроды па ўзгадненні з іншымі зацікаўленымі дзяржаўнымі органамі, — фарміраванне комплексу мер па ўкараненні прынцыпаў зялёнай эканомікі ў галінах народнай гаспадаркі краіны да 2020 года ў адпаведнасці з Асноўнымі палажэннямі праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2016—2020 гады, прынятымі на 5-м Усебеларускім народным сходзе, уключаючы павышэнне якасці жыцця насельніцтва на аснове росту канкурэнтаздольнасці эканомікі, прыцягненне інвестыцый і інавацыйнае развіццё.

План будзе спрыяць укараненню прынцыпаў зялёнай эканомікі ў розныя галіны народнай гаспадаркі (сельская і лясная гаспадарка, энергетыка і транспарт, прамысловая сфера (перш за ўсё машынабудаванне), будаўнічая галіна, а таксама сфера абясшкоджвання і другаснага выкарыстання адходаў) для садзейнічання павышэння патэнцыялу беларускай эканомікі, рэгіянальнага развіцця і паляпшэння якасці асноўных кампанентаў навакольнага асяроддзя.

3 лістапада 2016 года з 9.00 да 13.00 адбудзецца сход па абмеркаванні праекта. Для ўдзелу ў сходзе неабходна запоўніць рэгістрацыйную форму (указаная на старонцы) і накіраваць яе на адрас электроннай пошты hearings.aarhus@gmail.com да 27 кастрычніка 2016 года.

Па меры паступлення заўваг і прапаноў праект плана будзе дапрацоўвацца. Інфармацыя пра вынікі грамадскіх абмеркаванняў, змены ў праекце плана і прынятае рашэнне будуць размешчаны на вышэйпаказаным адрасе.

**Вераніка КОЛАСАВА**
*kolasava@zviazda.by*

■ Перспектыва

# Беспрацоўных раздзеляць

## Адным павялічаць дапамогу, а камусьці прапануюць аплаціць спецыяльны збор

**Праект указа аб павышэнні памеру дапамогі па беспрацоўі знаходзіцца на разглядзе ва ўрадзе, паведаміў учора начальнік упраўлення палітыкі занятасці Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Алег ТОКУН на брыфінгу «Практычныя аспекты рэалізацыі дэкрэта №3 “Аб папярэджанні сацыяльнага ўтрыманства”» ў прэс-цэнтры БЕЛТА.**

Праект указа ўжо падтрыманы Мінэканомікі і Мінфінам. Дакумент прадугледжвае павышэнне памеру дапамогі па беспрацоўі для двух катэгорый беспрацоўных. У першую катэгорыю былі аднесены тыя, хто звольнены ў сувязі са скарачэннем колькасці штату работнікаў або ліквідацыяй прадпрыемства. У міністэрстве прапануюць плаціць такім беспрацоўным дапамогу па беспрацоўі ў памеры 100% ад бюджэту пражытковага мінімуму. Да другой катэгорыі прылічылі тых, хто быў звольнены па ўважлівых прычынах, напрыклад у сувязі са сканчэннем тэрміну кантракта і іншых. Такім беспрацоўным суму дапамогі па беспрацоўі прапануецца прызначыць у памеры 50% бюджэту пражытковага мінімуму. У аналагічных памерах Мінсацабароны прапануе павысіць памер стыпендыі для тых грамадзян, якія праходзяць навучанне па накіраванні дзяржаўнай службы занятасці.

Разам з тым Міністэрства па падатках і зборах накіравала каля 50 тысяч паведамленняў на аплату збору для тых працаздольных жыхароў краіны, якія не ўдзельнічаюць у фінансаванні дзяржаўных расходаў. Аб гэтым на брыфінгу паведаміла **намеснік міністра па падатках і зборах Святлана ШАЎЧЭНКА**. «Аднак, калі хтосьці мае права на льготы, але адпаведную інфармацыю не прадставіў у падатковыя органы, ён можа прынесці дакументы ў інспекцыю, пасля чаго будзе прынята рашэнне пра выплату або вызваленне ад яе», — растлумачыла намеснік міністра.

Больш падрабязна аб захадах дзяржавы супраць сацыяльнага ўтрыманства чытайце ў наступных нумарах газеты.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Нагода

# ГІСТАРЫЧНЫ ЭКСКЛЮЗІЎ АД БДУ

**Напярэдадні 95-годдзя ў Беларускім дзяржаўным універсітэце рэалізаваныя два ўнікальныя праекты — «Электронны фотаархіў БДУ» (earchives.bsu.by) і сайт «Гісторыя Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта» (time.bsu.by). Пра гэта расказаў на сустрэчы з журналістамі рэктар БДУ, акадэмік Сяргей АБЛАМЕЙКА.**

Фотаархіў уяўляе сабой сховішча электронных дакументаў, якія адлюстроўваюць як сучасныя будні БДУ, так і падзеі амаль стогадовай даўнасці. Ён змяшчае фатаграфіі рэктараў універсітэта, акадэмікаў, ганаровых прафесараў, здымкі студэнтаў і выкладчыкаў — удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. У архіве можна знайсці і фатаграфіі карпусоў універсітэта, датаваныя рознымі гадамі. Многія з прадстаўленых работ з'яўляюцца эксклюзіўнымі.

Сайт «Гісторыя Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта», у сваю чаргу, дапамог увекавечыць самыя яркія і важныя падзеі ў жыцці ўстановы. Лёсавызначальныя для ўніверсітэта моманты падаюцца праз прызму прафесійнай дзейнасці яго рэктараў, знакамітых супрацоўнікаў і выпускнікоў. На сайце размешчана рубрыка «Гэты дзень у гісторыі БДУ», дзе адлюстроўваюцца падзеі, якія адбыліся ў гэты час у папярэднія гады.

Найбуйнейшая і найстарэйшая ВНУ краіны рыхтуецца 30 кастрычніка адзначыць свой 95-гадовы юбілей. Па сутнасці, БДУ стварыў у краіне сістэму вышэйшай адукацыі і нават навукі. Першы рэктар, прафесар Уладзімір Пічэта, быў ініцыятарам стварэння Акадэміі навук БССР, а дэкан факультэта грамадскіх навук БДУ Усевалад Ігнатоўскі пасля стаў яе першым кіраўніком. За першыя 10 гадоў свайго існавання Белдзяржуніверсітэт стаў базай для стварэння дванаццаці ВНУ і шэрагу навукова-даследчых інстытутаў рэспублікі.

Калі казаць пра цяперашні час, то БДУ працягвае дынамічна развівацца. Сёння гэта магутны вучэбна-навукова-вытворчы комплекс. «Мяркую, калі б стваральнікі ўніверсітэта пагледзелі на сваё дзецішча сёння, яны б ім ганарыліся», — падкрэслівае Сяргей Абламейка.

На пастаяннай аснове ў БДУ сёння працуюць 7 акадэмікаў і 6 членаў-карэспандэнтаў НАН Беларусі, 319 дактароў навук і 1538 кандыдатаў навук.

Усяго на пачатак 2016/2017 навучальнага года на першай і другой ступенях вышэйшай адукацыі ў Белдзяржуніверсітэце навучалася 29 тысяч студэнтаў, у тым ліку больш як 2,3 тысячы замежных грамадзян. «Геаграфія» экспарту адукацыйных паслуг ахоплівае паўсотні краін свету. Ва ўніверсітэце апошнія гады актыўна пашыраецца выкладанне на замежных мовах.

За пяць апошніх гадоў у БДУ на першай ступені навучання было адкрыта 18 новых спецыяльнасцяў і 6 новых напрамкаў. Плюс 29 новых спецыяльнасцяў у магістратуры і 5 спецыяльнасцяў перападрыхтоўкі.

Сярод новых — «мікрабіялогія», «біяхімія», «геаінфармацыйныя сістэмы», «хімія лекавых злучэнняў», «фізіка нанаматэрыялаў і нанатэхналогій», «камп'ютарная фізіка», «ядзерная фізіка і тэхналогіі», «гідраметэаралогія» і іншыя.

БДУ супрацоўнічае больш чым з 450 замежнымі навукова-адукацыйнымі ўстановамі з 60 краін свету.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*



Студэнты БДУ на цаліне, 1956 год.

■ Армія

# ДАЛЁКА НАПЕРАД

## Кіраўнікі рэспубліканскіх СМІ асабіста пераканаліся ў надзейнасці сучаснай беларускай арміі

**У семінары з кіраўнікамі вядучых айчынных сродкаў масавай інфармацыі, які штогод праводзіцца ў Міністэрстве абароны, традыцыйна прыняў удзел кіраўнік ваеннага ведамства Андрэй РАЎКОЎ. Сёлета рэдактары і іх намеснікі прайшліся па вучэбных класах, салдацкіх пакоях і нават пастралялі са стралковай зброі, што знаходзіцца на балансе 120-й асобнай гвардзейскай механізаванай брыгады.**

Пасля кароткага экскурсу ў гісторыю злучэння кіраўнікам рэспубліканскіх сродкаў масавай інфармацыі прадэманстравалі ўзоры формы адзення Узброеных Сіл. Пазнаёміліся прадстаўнікі масмедыя і са стралковай зброяй, на якой свае майстэрства адточваюць байцы брыгады. І нават — ужо на стрэльбішчы — змаглі не толькі патрымаць пісталеты, вінтоўкі, аўтаматы і гранатамёты ў руках, а і трапіць з іх у цэль.

— Так атрымалася, што за восем гадоў майго дырэктарства на семінар я выбралася сама: звычайна дэлегавала сваіх намеснікаў, галоўных рэдактараў газет, — прызналася **генеральны дырэктар інфармацыйнага агенцтва «Мінск-Навіны» Кацярына ДУБІНСКАЯ**. — Гэтым разам, убачыўшы радок пра 120-ю брыгаду, я вырашыла, што абавязкова трэба ехаць, бой мой сын чатыры гады таму праходзіў тут службу. Уражвае, што, нягледзячы на дрэннае надвор'е (у той дзень, калі праводзіўся семінар, ні на хвіліну не пераставаў ісці дождж. — **Аўт.**), нас сустрэлі ў поўнай баявой гатоўнасці.



Пабываўшы ў казарме, кіраўнікі СМІ высока ацанілі ўмовы ў пакоях, дзе адпачываюць салдаты. Пабывалі і ў мясцовай альма-матар: менавіта тут учарашнія прызыўнікі асвойваюць вайсковую навуку. У класах, абсталяваных сучаснымі трэнажорамі і іншай тэхнікай, юнакі становяцца стралкамі-зенітчыкамі, механікамі-вадзіцелямі, наводчыкамі-аператарамі і камандзірамі танка і БМП.

— Армія не стаіць на месцы, яна развіваецца, і журналістам заўжды цікава ўбачыць гэтыя змены ў рэальным маштабе часу, — лічыць **першы намеснік галоўнага рэдактара «Советской Белоруссии» Міхаіл ЛЯБЕДЗІК.** — Сюды я прыехаў з асаблівым хваляваннем, бо некалі менавіта ў гэтай брыгадзе я праходзіў зборы пасля ваеннай кафедры, тут стаў афіцэрам запасу і прымаў вайсковую прысягу. Гэта было ў 1991 годзе, і з таго часу змянілася вельмі многае. Можа быць, некаторыя ўзоры ўзбраення засталіся ранейшымі, але таго, што мы ўбачылі ў навучальных класах, у наш час, вядома, не было. Сённяшняму чалавеку важна разумець, што яго абаранае магутная і надзейная армія.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Пра гэта, а ў глабальным сэнсе пра перспектывы развіцця і будаўніцтва Узброеных Сіл у кантэксце падзей, якія адбываюцца ў свеце, пагаварыў з кіраўнікамі СМІ міністр абароны генерал-лейтэнант Андрэй Раўкоў.

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*

# ДРУК УЖО НЕ ТОЙ


Загадчык лабараторыі Сяргей ФІЛАТАЎ *(злева)*, інжынер-тэхнолаг Віталь БАГРАЦОЎ *(у цэнтры)* і малодшы навуковы супрацоўнік Яўген БАТЫРАЎ падчас працы над лічбавай мадэллю чарговага вырабу.

## Не трэнд, а патрабаванне часу

Побач з чорнай скрыняй знаходзіцца падстаўка, на якой ляжыць кавалак сіняга пластыку. Над ім бесперапынна рухаецца экструдар — галоўка, з якой цягнецца тонкая нітка расплаўленага палімеру. Слой за слоем ён наносіцца на аснову, і паступова пачынаюць вымалёўвацца абрысы будучай дэталі. Рухамі экструдара кіруе камп'ютар, у які загружана аб'ёмная лічбавая мадэль вырабу. Гэта працуе 3D-прынтар па тэхналогіі FDM — чатыры такія апараты з магчымасцю дадання нанаматэрыялу ў вобласць друку былі створаны супрацоўнікамі Акадэміі навук.

— Актыўна займацца адытыўнымі тэхналогіямі мы пачалі прыкладна тры гады таму, — узгадвае **загадчык лабараторыі сінтэзу і аналізу макра- і нанапамерных матэрыялаў Інстытута цепла- і масаабмену Сяргей ФІЛАТАЎ**. — Асноўнае іх адрозненне ад традыцыйных заключаецца ў тым, што падчас стварэння вырабу новы матэрыял дадаецца (звычайна паслойна) да ўжо існуючага. У той час як прывычныя нам тэхналогіі працуюць па «адымальным» прынцыпе, калі масіў загатоўкі механічна апрацоўваюць, прыбіраючы ўсё лішняе. У нашым інстытуце вы можаце пабачыць толькі невялікі спектр адытыўных тэхналогій. Цяпер, напрыклад, актыўна развіваецца работа з такім матэрыялам, як метал. Адпаведныя 3D-прынтары працуюць па іншым прынцыпе: у спецыяльную ёмістасць засыпаецца металічны парашок, які слой за слоем спякаецца пры дапамозе лазера. Таму «друк» з такіх рэчываў — ужо таксама дасягненне сучаснасці. Інстытут парашковай металургіі якраз набывае для сваіх мэт адзін такі апарат.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

**«Эйфарыя ад развіцця адытыўных тэхналогій, калі з іх дапамогай стваралася ўсё, што толькі можна, ужо прайшла».**

Навуковец падкрэслівае, што праца НАН у кірунку адытыўных тэхналогій — не проста даніна сусветнаму трэнду. Па яго словах, буйныя навуковыя ўстановы накшталт Акадэміі навук сёння проста не могуць абыходзіцца без 3D-друку.

— Узяць хаця б нашы атамна-сілавыя мікраскопы. Адзін з асноўных вузлоў гэтай тэхнікі — сканер, дэталі якога ў «класічным» выкананні робіцца з металу. Мы ж робім іх на 3D-прынтарах, гэта значна танней. Часам узнікае неабходнасць стварыць макет якога-небудзь вырабу, каб праверыць працаздольнасць перад тым, як выпускаць яго ў серыю. Даўгавечнасць ад такой рэчы не патрабуецца, таму мы таксама друкуем іх з палімераў. Нам больш не прыходзіцца звяртацца да іншых прадпрыемстваў, мы можам самі зрабіць усё хутка ва ўласных лабараторыях.

## Правілы дыктуе эканоміка

Безумоўна, у якасці галоўнага спажыўца адытыўных тэхналогій цяпер разглядаюцца буйныя індустрыяльныя прадпрыемствы. Сферамі магчымага ўжывання 3D-прынтараў ужо становяцца дакладнае машынабудаванне, хімічная прамысловасць, космас. У ЗША, напрыклад, нядаўна «надрукавалі» соплы рэактыўнага рухавіка са сплаву плаціны і ірыдыя. Гатовы выраб не толькі валодае лепшымі тэхнічнымі характарыстыкамі, чым зроблены традыцыйным спосабам аналагі, але і каштуе значна танней.

— Найбольш працаёмкі этап стварэння вырабу па адытыўных тэхналогіях — распрацоўка аб'ёмнай мадэлі, — расказвае Сяргей Філатаў. — У нас у інстытуце пры дапамозе спецыяльнага праграмнага забеспячэння, напрыклад расійскай праграмы «Компас-3D», робяцца адпаведныя «віртуальныя чарцяжы». Супрацоўнікі могуць тут жа, на камп'ютары, праверыць характарыстыкі будучага вырабу, калі мадулююцца нагрузкі на матэрыял.

Увогуле, 3D-друк — гэта выдатная тэхналогія для вытворчасці прадукцыі ў невялікай серыі ці ўвогуле ў адзінкавым экзэмпляры. Адначасова існуе канцэпцыя «настольнай фабрыкі». Згодна з гэтай ідэяй, спажывец будзе набываць не фізічны варыянт прадукцыі, а толькі яго электронную мадэль, каб потым надрукаваць тавар на дамашнім 3D-прынтары.

Заводам, у сваю чаргу, не трэба будзе траціць велізарныя сродкі на захаванне вялікіх аб'ёмаў нерэалізаванага тавару на складах і лагістыку. Дэталь можа быць надрукавана максімальна блізка да месца свайго будучага прымянення. Класічны прыклад — Міжнародная касмічная станцыя, дзе ўсталяваны прынтары ўжо другога пакалення. Калі ўзнікае патрэба ў нейкім вырабе, яго распрацоўваюць інжынеры на Зямлі, а потым мадэль у электронным выглядзе перадаецца ў космас.

— Некаторыя распрацоўкі ўжо цяпер знаходзяць прымяненне ў медыцыне, але гэта толькі першыя крокі, — падкрэслівае Сяргей Філатаў. — У першую чаргу размова пра прагназаванне і падрыхтоўку аперацый. Нашы калегі з Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра траўматалогіі і артапедыі ўжо карыстаюцца пэўнымі напрацоўкамі. Напрыклад, калі ёсць неабходнасць разгледзець не толькі тамаграму нейкага органа ці складанага злучэння (скажам, сустава) на камп'ютары, яны адпраўляюць нам дадзеныя, а мы паводле іх ствараем і друкуем аб'ёмную мадэль.

Магчымасцямі адытыўных тэхналогій ужо карыстаюцца і буйныя беларускія прадпрыемствы. Па інфармацыі суразмоўцы, на мінскім заводзе «Атлант» прататыпы пральных машын ствараюцца на 3D-прынтарах.

— Цяпер мы перажываем этап станаўлення адытыўных тэхналогій, — кажа навуковец. — У некаторых грамадзян дома ці на рабоце ёсць маленькія палімерныя 3D-прынтары, якія выкарыстоўваюцца для розных задач. Але гэта не вельмі рацыянальна. Я мяркую, што мы з цягам часу прыйдзем да стварэння адмысловых цэнтраў з высокапрадукцыйнымі прынтарамі, доступ да якіх будзе ў любога чалавека. Эйфарыя ад развіцця адытыўных тэхналогій, калі з іх дапамогай стваралася ўсё, што толькі можна, ужо прайшла. Правілы пачаў дыктаваць не энтузіязм, а эканоміка.

## Пакуль некрытычна, але...

Развіццё адытыўных тэхналогій вядзецца ў цэлым шэрагу структурных падраздзяленняў НАН. У Інстытуце хіміі новых матэрыялаў нядаўна распрацавалі спосаб экструдавання палімераў для 3D-прынтараў. Важная асаблівасць — «напаўняльнік» для друку робяць з мясцовай сыравіны. У гродзенскім філіяле Інстытута цепла- і масаабмену працуюць над стварэннем новых палімерных матэрыялаў для адытыўных тэхналогій. Вядуцца распрацоўкі па друку з ужываннем адразу некалькіх палімераў, своеасаблівага «сплаву», вырабы з якога па трываласці не саступаюць металічным. Яшчэ адзін перспектыўны кірунак — біянічны дызайн. Сутнасць яго ў тым, што ўнутраная структура вырабу будуецца па «прыродных» прынцыпах, напрыклад як соты ў пчаліных вуллях.

— Мы ўжо некалькі гадоў праводзім рэгулярныя семінары па тэме адытыўных тэхналогій, — адказвае на пытанне аб перспектывах развіцця кірунку ў Беларусі Сяргей Філатаў. — Туды запрашаюцца прадстаўнікі акадэмічных інстытутаў, прадпрыемстваў, Міністэрства адукацыі для абмеркавання сумесных планаў і абмену досведам. Пра аб'яднанне асобных устаноў у кластар, як гэта робіцца з некаторымі іншымі кірункамі, размовы пакуль не ідзе, бо для нашай эканомікі 3D-друк пакуль не з'яўляецца «крытычнай» тэхналогіяй. У адрозненне ад Расійскай Федэрацыі, дзе на розных прадпрыемствах ужо выкарыстоўваецца каля сотні высокапрадукцыйных прынтараў для працы з металічнымі гарачатрывалымі сплавамі, мы толькі цяпер набываем першы апарат такога класа. Безумоўна, у нас таксама ёсць прадпрыемствы, якія цікавіць гэты кірунак, але мы развіваемся паступова. Нядаўна ў Беларускім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце з'явілася новая спецыяльнасць, дзе рыхтуюць кадры для сферы адытыўнай вытворчасці. Для гэтых патрэб набылі некалькі цікавых машын. Ёсць ідэя аб стварэнні асобнай кафедры, якая аб'яднае студэнтаў з фізічнага, хімічнага факультэтаў і факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ, але пакуль яна застаецца на ўзроўні планаў.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.
Такія гаечныя ключы друкуюць на 3D-прынтарах у якасці сувеніраў. Але інструмент — у працоўным стане.

# ГЭТЫ ЗБОР НЕ КУСАЕЦЦА



Не трэба будзе плаціць падатак за вясковы дом пенсіянерам па ўзросце, інвалідам I і II груп, а таксама непрацаздольным грамадзянам, бо менавіта ім дзяржава прадастаўляе такую льготу. Аднак у тым выпадку, калі ў доме будуць зарэгістраваныя нейкія іншыя асобы — ужо працаздольныя грамадзяне, падатак давядзецца плаціць. І тут неабавязкова, каб у гэтай хаце нехта трэці сапраўды жыў. Для падатковай хопіць таго, што на гэтыя метры пенсіянеры «прапішуць» сына ці ўнука.

## ГАСПАДАРАМ КАТЭДЖАЎ І НЕКАЛЬКІХ КВАТЭР

Наступным варыянтам стануць больш заможныя ўладальнікі, якія жывуць у загарадным доме. У гэтым выпадку падатак прапануюць заплаціць усім, акрамя пенсіянераў і інвалідаў I і II груп. Але і яны таксама страцяць гэтую льготу, калі зарэгіструюць у сваім доме працаздольнага грамадзяніна. Дарэчы, для налічэння падатку не будзе мець значэння, працуе гэты грамадзянін ці не і ці жыве ён у гэтым памяшканні? Сам факт яго рэгістрацыі — ужо падстава для налічэння падатку.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Яшчэ адзін цікавы варыянт для падатковай, калі ў чалавека ва ўласнасці ёсць дзве кватэры (ці больш). І ў такім выпадку льгота па аплаце падатку па-ранейшаму будзе прадастаўляцца на адну кватэру. А вось за другую (і наступныя) трэба заплаціць поўнасцю. Звычайна сума маёмаснага падатку складае 0,1% ад ацэначнай або рыначнай вартасці нерухомасці за год. Праўда, цяпер стаўку падатку зрабілі на ўзроўні 0,2% ад ацэначнага або рыначнага кошту нерухомасці за год менавіта для тых, «хто мае на праве ўласнасці два і больш жылых памяшканняў у шматкватэрных і (або) блакіраваных жылых дамах».

З якой менавіта з гэтых дзвюх (і больш) кватэр неабходна будзе аплачваць падатак на нерухомасць, уласнік жылля вырашае самастойна. Для гэтага яму неабходна звярнуцца ў падатковы орган па месцы афіцыйнага жыхарства (рэгістрацыі) і напісаць заяву, у якой трэба паказаць усе ўласныя кватэры, а таксама асобна тое жылое памяшканне, у дачыненні да якога падатковым органам будзе прадастаўлена льгота па аплаце падатку. Калі вы гэтага не зробіце, то падатковая інспекцыя аўтаматычна прадаставіць ільготу для той кватэры, якая была набыта раней за астатнія.

У прэс-службе Міністэрства па падатках і зборах (МПЗ) удакладнілі, што гэтае правіла будзе працаваць незалежна ад таго, размешчаны гэтыя кватэры ў адным горадзе ці ў розных населеных пунктах.

І яшчэ пра пенсіянераў і іншых ільготнікаў. Усе такія ўласнікі некалькіх кватэр будуць павінны плаціць маёмасны падатак. Выключэнне тут — толькі для шматдзетных сем'яў (якія маюць трох і больш непаўналетніх дзяцей), калі апошнім належаць кватэры, што размешчаны ў шматкватэрных жылых дамах. Ад маёмаснага падатка вызваляюцца ўсе (!) кватэры шматдзетнай сям'і. Аднак гэтая льгота ў шматдзетных адразу страчваецца, як толькі старэйшыя дзеткі ў сям'і падрастаюць і мяняецца яе статус.

## САМАСТОЙНАЯ АЦЭНКА

Спецыялісты МПЗ звяртаюць увагу на тое, што паказаныя стаўкі падатку на нерухомасць, як правіла, не з'яўляюцца канчатковымі, бо мясцовыя Саветы дэпутатаў маюць права іх павялічваць або памяншаць да 2,5 раза. Так, падатак на нерухомасць аплачваецца з яе ацэначнай вартасці, якая вызначаецца без удзелу грамадзяніна. У той жа час, калі ўласнік прадставіць у падатковую інспекцыю заключэнне аб ацэнцы, дзе вызначаны рыначны кошт нерухомасці, то падатак будзе вылічацца з сумы, паказанай у такім заключэнні.

## І З ДАЎГАБУДАМ — БЕЗ ВАРЫЯНТАЎ

Падатак на нерухомасць давядзецца плаціць нават у тым выпадку, калі дом не дабудаваны. Дамы, якія маюць падмурак, сцены, дах або будаўніцтва якіх завершана, але яны афіцыйна не зарэгістраваныя, таксама падлягаюць абкладанню падаткам на нерухомасць. Больш за тое, гэтае правіла дзейнічае незалежна ад таго, ці ёсць у гаспадара ва ўласнасці нейкія іншыя аб'екты нерухомасці.

Увогуле падатак на нерухомасць вылічваецца за перыяд з 1 студзеня за год альбо з 1 чысла месяца, наступнага за месяцам, у якім паўстала права ўласнасці на нерухомасць; была адкрыта спадчына; набыта (атрымана, пабудавана) нерухомасць, не завершаная будаўніцтвам.

Пры адчужэнні нерухомасці падатак на маёмасць аплачваецца да канца месяца, у якім было спынена права ўласнасці на яе. Калі нерухомасць знаходзіцца ў агульнай долевай уласнасці некалькіх грамадзян, то падатак на нерухомасць налічваецца кожнаму з іх прапарцыянальна іх долі.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

Сямейная газета
Выпуск № 20 (63)



# ІГОЛКА НА ДАРОЗЕ

Як вы ратуецеся ад восеньскай хандры? Прынамсі я — натхняюся неверагоднымі прыгодамі сям'і Мумі Троляў, танцую па вечарах з мужам пад энергічныя песні Жанны Агузаравай і рыхтую прыемныя сюрпрызы блізкім...

Якраз у той момант, калі я падпісвала ў метро паштоўку сяброўцы, да мяне падсела даўняя знаёмая. На пытанне «як маешся?» Воля замест звыклага «нармалёва» цяжка ўздыхнула: «Неяк на душы няўтульна, можа прычоску памяняць? Ведала б ты, як я ненавіджу гэты шэры і дажджлівы горад!.. Вось бы пераехаць жыць за мяжу, туды, дзе лета круглы год — і ўсё дакладна змянілася б...»

...Жыў у шматлюднай вёсцы мужчына. І заўсёды ён быў нечым незадаволены. Хто б што ні зрабіў — усё яму не падабалася. І тое не так, і гэта не так. Нават надвор'е было нагодай для бурчання: у дождж яму патрабавалася сонейка, у сонечнае надвор'е — дождж. І вось аднойчы мужчына вырашыў: раз усе навокал як быццам згаварыліся раздражняць яго, то будзе лепш, калі ён адправіцца ў лес і пажыве там адзін. Балазе ведаў, што ў глушы стаяла закінутая хатка. Туды і накіраваўся, вырашыўшы: людзей там няма і раздражняць яго не будзе каму. І вось з-за дрэў паказаліся драўляныя аканіцы... Мужчына хацеў ужо ўзрадавацца, як раптам зачапіўся за корч і паляцеў у яр. Усхапіўся на ногі і пачаў лаяцца на чым свет стаіць. Потым вылез з яра, падышоў да хаткі, сеў на парог, задумаўся і... як засмяецца! Зразумеў, нарэшце, што куды б ні рушыў, усюды для яго знойдзецца нагода для незадаволенасці.

Калісьці я таксама ўцякала ад сябе і шукала паратунку ў цырульні ды за мяжой. Але з новай прычоскай ды каля мора — нічога не мянялася. Як было няўтульна ўнутры, так і заставалася... Да таго моманту, пакуль не зразумела адну важную рэч...

...Аднойчы ўвечары ў часы, калі яшчэ не было электрычнасці, жанчына шукала штосьці на дарозе каля свайго дома. Сонца ўжо амаль зайшло, пакрысе змяркалася.

— Што ты шукаеш тут? — запыталіся жыхары суседніх дамоў.

— Я згубіла іголку.

— Дарога такая вялікая, а іголка такая маленькая. Знайсці яе будзе цяжка, але мы табе дапаможам. Толькі падкажы, дзе прыблізна яна ўпала...

— Справа ў тым, што яна ўпала зусім не тут, а ў доме.

— Дзівачка! Мы даўно прыкмецілі, што ты як не з гэтага свету! Калі іголка ўпала ў доме, навошта ж шукаеш яе на дарозе?

— Бо ўнутры дома цёмна, а звонку, пакуль не села сонца, яшчэ ёсць трохі святла.

Суседзі засмяяліся і сталі разыходзіцца па дамах.

— Пачакайце! Я ж толькі прытрымліваюся вашага прыкладу. Вы самі спрабуеце шукаць суладдзе ў вонкавым свеце, забыўшыся на першае і найважнейшае пытанне: дзе страцілі яго?.. А адказ вельмі просты: мы страцілі яго ўнутры саміх сябе. А шукаем звонку з той простай прычыны, што нашы вочы глядзяць вонкі — і там ёсць трохі святла.

Калі сапраўды хочаш, каб нешта змянілася, варта пачаць змены са сваёй душы, а не з прычоскі, абноўкі, месца жыхарства. Бо куды б ні накіраваўся, ты бярэш з сабой сябе. А ад сябе нельга ўцячы...

Праўда, часам трэба абысці ўвесь свет, каб зразумець, што скарб закапаны ля твайго ўласнага дома.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**
*nadzieja@zviazda.by*

■ Гэта па-нашаму!

# «Дзеці не павінны быць важнейшымі за мужа»

## Сям'я з Брэста стварыла беларускамоўны каляндар для супер-мам

**Аднойчы за кубачкам кавы ілюстратар Ганна Радзько разам з мужам, праграмістам Сяргеем Хамічуком, прыдумалі свой маленькі сямейны брэнд. І вось ужо больш як два гады «Важны гусак» радуе нас дызайнерскімі паштоўкамі на роднай мове. ...Мы «сустрэліся» ў скайпе а дзясятай гадзіне вечара, пасля таго, як маладыя бацькі паклалі спаць сваю дачушку Ладу. Найперш радасная Аня паказвае новы каляндар з налепкамі, дзякуючы якому не толькі яна, але і іншыя загружаныя мамы змогуць планаваць свае справы...**

*(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)*




■ У вас будзе дзіця

# ЗНАЙДЗІЦЕ ЯГО ХУТЧЭЙ

**«Звязда» працягвае знаёміць патэнцыйных усынавіцеляў і апекуноў з хлопчыкамі і дзяўчынкамі, якія больш за ўсё на свеце мараць пра дружную сям'ю... Дзякуючы тэлевізійнай рубрыцы «У вас будзе дзіця» (што выходзіць на канале АНТ у рамках праграмы «Пакуль усе дома») 68 герояў ужо знайшлі клапатлівых бацькоў. Верым і спадзяёмся, што Вадзім неўзабаве папоўніць шчаслівы спіс.**



Гэты сімпатычны хлопчык пакуль што жыве і выхоўваецца ў дзіцячым доме №6 горада Мінска. Паводле слоў выхавальніцы Алены Гамбіцкай, Вадзім вельмі таварыскі і прыязны, кемлівы і добры, адкрыты і даверлівы. «Мець зносіны з ім — адно задавальненне. З Вадзімам ніколі не бывае праблем. Што тычыцца вучобы, то не ўсё адразу лёгка даецца, але галоўнае, што ў яго ёсць цярпенне ды імкненне да ведаў. «Я люблю бегаць, у даганялкі гуляць, — эмацыйна дзеліцца хлопчык, — а таксама складаць з канструктара самыя розныя штукі: робатаў, самалёты, тэлефоны». Яшчэ адно захапленне Вадзіма — маляванне, ён цудоўна малюе, прычым не толькі фарбамі ды фламастарамі. На свае вочы пераканаліся, як ён пры дапамозе настаўніцы расфарбаваў жоўта-чырвона-зялёным пластылінам звычайны кардонны кляновы лісток. Так, што не адрозніш ад сапраўднага.

«Такому творчаму хлопчыку, як Вадзім, патрэбна асаблівая цеплыня, — кажа Алена Гамбіцкая. — Мы даём яму ў дзіцячым доме многае, але тое, што можа даць сапраўдная сям'я, дзе ёсць мама, тата, магчыма, брат і сястра, — крыху іншае. Таму знайдзіце яго хутчэй...»

***Калі вы хочаце даведацца пра Вадзіма больш, патэлефануйце па нумары (017) 284-71-51 спецыялістам Нацыянальнага цэнтра ўсынаўлення Міністэрства адукацыі. Таксама для тых, хто хоча ўсынавіць дзіця, на сайце videopassport.ru змешчаны відэакурсы, падрыхтаваныя сумесна НЦУ і творчай групай праекта***

■ Круглы стол

# УРОКІ ПЯШЧОТЫ

## Хто іх павінен даваць: сям'я ці школа?

**Як выхоўваць сваіх дзяцей, на што звярнуць увагу бацькам і настаўнікам? Адказы на гэтыя пытанні паспрабавалі даць удзельнікі «круглага стала» «Моцная сям'я — моцная дзяржава: маральныя асновы грамадства і дзяржавы», што прайшоў падчас Тыдня маці ў сталічным храме-помніку ў гонар Усіх Святых. Міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ падчас уручэння ўзнагарод пераможцам рэспубліканскага творчага конкурсу сярод друкаваных і электронных сродкаў масавай інфармацыі «Моцная сям'я — моцная дзяржава» падкрэсліла вялікую ролю газет, тэлебачання і інтэрнэт-рэсурсаў у фарміраванні каштоўнасцяў, як грамадства ў цэлым, так і кожнай канкрэтнай асобы ў прыватнасці. І заклікала журналістаў не гнацца за страшнымі гісторыямі, а паказваць станоўчыя прыклады, каб прывіваць дзецям маральнасць і духоўнасць, павагу да сваіх бацькоў, святыняў, гісторыі, традыцый.**

**Настаяцель Усіхсвяцкага прыхода протаіерэй Фёдар ПОЎНЫ** выказаў думку, што



нядрэнна, каб у школах з'явіліся ўрокі пяшчоты: «Шмат гора прынесла вайна беларускаму народу. Цяпер жа нам не пагражае ні француз, ні немец, ні італьянец, затое пагражае падлетак-мізантроп з бензапілой ці з сумкай, набітай узрыўчаткай, які вырашыў здабыць славу першага беларускага тэрарыста. Гэта трывожныя званочкі ў тым ліку і аб тым, якія каштоўнасці навязвае нашым дзецям медыяпрастора. Мы рухаемся, паўтараючы лякала іншых краін, карыстаемся чужымі каштоўнасцямі — і атрымліваем такі ж вынік. У нас з'яўляюцца свае «Брэйвікі», якія вяршаць лёсы людзей. Нам трэба будаваць сваю моцную інфармацыйную прастору. Трэба выхоўваць беларусаў, а не людзей глабальнага свету. Мы не можам дазволіць сваёй краіне растраціць свае духоўныя арыенціры. Неабходна тэрміновая рэабілітацыя інстытута сям'і, цяпер ён часткова страціў сваё значэнне. Калі я чую, што дзіця, якое не ходзіць у сад, не адаптаванае да соцыуму (я, дарэчы, таксама ў дзяцінстве не хадзіў у сад), то магу запярэчыць: не адаптаванае тое дзіця, якое не мае паўнавартаснай сям'і. І калі дзеці не паважаюць бацькоў і настаўнікаў, то грамадства ўпэўнена каціцца пад адхон, парушаючы пятую, самую простую, запаведзь «Шануй бацьку твайго і маці тваю...» Менавіта ў сям'і дзіця вучыцца пяшчоце і душэўнай цеплыні (бо пры ўсім мностве школьных факультатываў у школе няма пакуль урока пяшчоты). У сям'і чалавек пераадольвае эгаізм і спасцігае, што такое сапраўднае даравanне, трэніруе цярпенне. Не будзе сям'і — не застанецца на зямлі ніводнага цярплівага чалавека. Напэўна, і такое паняцце, як цярпенне, знікне. Неяк у сацсетках з'явіліся здымкі адной пары. «Як вам удалося пражыць столькі гадоў разам?» — пытаецца ў іх журналіст. «Мы жылі ў той час, калі нічога не выкідалі», — адказалі яны. Галоўнае правіла моцнай сям'і — любоў. Не тая любоў, якую называюць цяпер цягай, жарсцю. А тая, якая, па словах апостала, «даўгацерпіць, уміласціўляецца, не зайздросціць, не праслаўляе сябе, не ганарыцца, не бушуе, не шукае свайго, не раздражняецца, не намышляе зла, не радуецца з няпраўды, а разам цешыцца з ісціны; усё пакрывае, усяму верыць, на ўсё спадзяецца, усё пераносіць».

***Жанна РАМАНОВІЧ*, старшыня камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама:** «Усё пачынаецца з сям'і. Я па родзе сваёй дзейнасці часта назіраю, як дзеці крыўдзяць сваіх бацькоў. Калі прыходзіць сын і пачынае табе даказваць, што маме дрэнна з ім дома, а ў інтэрнаце будзе добра, бо там развітыя камунікацыі і шмат зносін. Калі сям'я адмаўляецца забіраць тату з інтэрната, куды прыстроіла яго на месяц, каб з'ездзіць у адпачынак. Кажуць: «Разумееце, мы выкінулі яго спальнае месца»... Адкуль такое стаўленне да сваіх бацькоў?.. Трэба змалку прывіваць дзецям павагу да старэйшых. Важна паказваць станоўчыя прыклады, расказваць пра сям'ю, дзе 13 дзяцей і ў кожнага — у адной руцэ скрыпка, у другой — ракетка, а за спінай — мальберт. Дзе кожнае дзіця думае пра тое, як дапамагчы меншым, каб было лягчэй



бацькам. Такія гісторыі павінны быць на першых старонках газет. У школе таксама варта вучыць дзяцей, як правільна ствараць сям'ю, тлумачыць, што шлюб — гэта адказнасць за свайго партнёра, дзяцей. Мы шмат кажам пра абавязкі жанчыны ў шлюбе. Лічу, што больш павінны казаць пра абавязкі мужчыны. Вельмі радуе, што больш з'яўляецца прыкладаў свядомага бацькоўства, што з'яўляюцца тата-школы. Важна актывізаваць ролю таты ў выхаванні свайго дзіцяці».

**Антаніна МОРАВА, сустаршыня Беларускага саюза жанчын:** «Тата-школам трэба выступіць з ініцыятывай аб зацвярджэнні дня таты ў краіне. Як наш саюз жанчын калісьці выступіў з ініцыятывай, каб у нашай краіне



быў дзень маці. Тут гучала такая думка, што ў шчаслівай сям'і растуць шчаслівыя дзеці, я яшчэ дадала б — і ў поўнай. Прыемна, што памяншаецца колькасць дзетак, якія нарадзіліся па-за шлюбам. Сёлета такіх 10%».

**Раіса СІДАРЭНКА, намеснік міністра адукацыі:** «Займацца выхаваннем майго сына



(дачкі) павінна школа, бо большую частку часу ён (яна) праводзіць там», — кажуць некаторыя бацькі. «Мая асноўная задача даць дзіцяці тыя веды, якія дазволяць яму здаць цэнтралізаванае тэсціраванне ды паступіць у ВНУ», — лічаць некаторыя настаўнікі. Але дазвольце не пагадзіцца ні з адной, ні з другой пазіцыяй. Бо галоўная мэта і ў бацькоў, і ў сістэмы адукацыі адна — выгадаваць дзіця годным чалавекам, які будзе кіравацца ў жыцці духоўнымі каштоўнасцямі. Таму трэба ўзаемадзейнічаць. А калі пачнём размяжоўваць ролю сям'і і школы ў выхаванні — нічога добрага з гэтага не атрымаецца.

Што тычыцца ўрокаў пяшчоты і дабрыні, дык гэтымі пачуццямі павінны быць прасякнуты ўсе ўрокі, незалежна ад таго, літаратура гэта, гісторыя ці мова».

**Надзея ЕРМАКОВА, намеснік старшыні «Беларускага саюза жанчын»:** «Не сакрэт, што дабрыня выратуе свет. Таму важна з пялюшак прывіваць дзецям гэтую якасць. Бо калі ў некага разумненькая галава, але ўнутры, у душы, пасяліўся благі дух — ніколі ад яго дабра не будзе. Ён можа быць прафесіяналам у сваёй справе і



ў той жа час благім чалавекам. Як прывіць тое добра? Я лічу, што трэба ў школе ўводзіць урокі веры, вывучаць Біблію, Закон Божы. Гэта і ёсць адзін з элементаў урокаў пяшчоты».

**Вікторыя МЯНАНАВА, старшыня Цэнтральнага савета Беларускай рэспубліканскай піянерскай арганізацыі:** «Сучасныя дзеці сядзяць у гаджэтах, сацыяльных сетках, іх бацькі ў гэты час стараюцца зарабіць як мага больш грошай. Задача нашых грамадскіх ініцыятыў, у тым ліку, нагадваць, што духоўнасць, людскасць і зносіны павінны быць на першым месцы. У межах валанцёрскага руху «Добрае сэрца» мы ладзім дабрачынныя марафоны. І такім чынам дапамагаем сем'ям, у якіх дзеці маюць патрэбу ў дарагіх аперацыях, апаратах для далейшай жыццядзейнасці. Так, дзякуючы нашай падтрымцы, была зроблена аперацыя па перасадцы ныркі Лізе Мароз з Маладзечна. Сёння гэтая дзяўчынка — сімвал нашага праекта, які існуе 7 гадоў. Праз месяц такі марафон адбудзецца ў Гомелі ў падтрымку 3-гадовай Кіры, якой патрэбна аперацыя коштам 250 тысяч долараў. Зразумела, што адным мерапрыемствам мы не збяром усю суму, але грамадскі рэзананс выклічам. Нашы валанцёры дзяжураць на сельскагаспадарчых кірмашах і актыўна дапамагаюць пажылым людзям даставіць



Фота Надзеі БУЖАН.

дадому мяшкі з бульбай. Валанцёрскія праекты дапамагаюць разварушыць у людзях такія якасці, як спачуванне і міласэрнасць. Цудоўна, калі прыклад грамадскіх арганізацый падмацоўваецца бацькамі дома. Калі, напрыклад, мама і дачка адбіраюць адзенне, з якога дзяўчынка вырасла, і нясуць яго ў сацыяльны прытулак дзеткам, якія маюць патрэбу. Гэта таксама элементы ўрокаў пяшчоты і дабрыні».

**Надзея ДРЫЛА.** *dryla@zviazda.by* ■

■ Фотаздымак з гісторыяй

# ХЛЕБ БЫЎ НА ВАГУ ЗОЛАТА

**Калі я прыязджаю з вучобы дадому, на Століншчыну, то з задавальненнем пераглядваю шматлікія альбомы з фотаздымкамі. Для мяне гэта адзіны спосаб апынуцца ў дзяцінстве сваіх блізкіх. Вось і гэтым разам я перабірала старыя, чорна-белыя здымкі бабулі, а яна мне расказвала пра кожны. На адным з іх — вяселле маіх прабабулі і прадзеда. Фатаграфіі амаль дзевяноста гадоў, і вось яе невялікая гісторыя.**

Дубіна Марта Фёдараўна і Ляшкевіч Сцяпан Фёдаравіч пажаніліся маладымі. Хлопец яшчэ нават не адслужыў у войску. Жылі на хутары пад назвай Ластавіца. Там было толькі пяць дамоў. Вакол — густы лес і шматлікія балоты. Сям'я жыла там увесь час, пакуль хутаранцаў не пачалі перасяляць у вёску Велямічы.

Як толькі ў 1939 годзе пачалася Другая сусветная, Сцяпан пайшоў на вайну. Праз нейкі час трапіў у канцэнтрацыйны лагер у Германіі. Вярнуўся толькі амаль праз сем гадоў. У Марты і Сцяпана было чацвёра дзя-



цей. Надзея, Марыя, Іван нарадзіліся да вайны, а Васіль — ужо пасля.

Вайна — час вельмі цяжкі. Марце было складана з трыма дзецьмі. Часта даводзілася ўцякаць ад немцаў. Бывала, жанчына запража валоў, пасадзіць на воз дзяцей і вязе. Калі немцы аднойчы падышлі да хутара, усім прыйшлося пакінуць хаты і пайсці ўглыб лесу з партызанамі. Тады жылі ў курэнях, наспех збудаваных з жэрдак і сасновых галін. Унутры такога жытла ледзь памяшчалася невялічкае вогнішча. Напаў тыф, і шмат хто загінуў ад хваробы.

Пасля таго як усё трохі супакоілася, Марта з дзецьмі вярнулася на свой хутар. У дарозе яна прыкмеціла немцаў, якія пачалі страляць. Жанчына несла маленькага Івана ў нейкай старой тканіне за плячыма, Марыйку трымала за руку, а Надзя ішла побач і ўсё пытала: «Матулечка, ці жывыя мы будзем?» Ім пашанцавала, сям'я прайшла незаўважанай.

Часта здаралася, што немцы пачыналі страляць недзе ў лесе, і тады маленькі Іван крычаў сёстрам: «Дзеўкі! Дзеўкі! Немцы страляюць, хаваемся ў карчы!»

Яшчэ больш клопату лягло на плечы хутаранцаў, калі немцы спалілі ўсе дамы. Але прыходзілася неяк выжываць. Есці не было чаго, і часта выручаў лес. Збіралі грыбы, ягады.

Пасляваенныя гады таксама былі няпростымі. У 1946 годзе вярнуўся Сцяпан. Яны з Мартай працавалі ў калгасе «За Радзіму». Сцяпан наймаўся касіць на ўвесь дзень за паўпуда хлеба, каб пракарміць сям'ю. Не было ні вопраткі, ні абутку. Плялі з лазы лапці.

У школу дзеці хадзілі за пяць кіламетраў лесам. Ішлі ў лапцях па вадзе, па балотах. У халоднае надвор'е заўсёды вельмі мерзлі ногі. І калі дзеці прыходзілі ў школу, якая была звычайнай драўлянай хаткай, настаўніца паліла грубку і садзіла ўсіх на печ, каб грэліся.

Так і жылі. Сцяпан, Марта і чацвёра іх дзяцей. Усіх выгадавалі, паставілі на ногі, хоць і былі складаныя часы, нічога не хапала, а хлеб быў на вагу золата...

**Марына ЛЯШКЕВІЧ.**

***Шаноўныя чытачы! Конкурс «Фотаздымак з гісторыяй» працягваецца. Мы па-ранейшаму чакаем ад вас цікавых фота з сямейнага альбома (за выключэннем леташніх здымкаў з курорта, вясельных фотасесій і сучасных фота дзяцей). Вам ёсць што паказаць і расказаць? Давайце пагартаем сямейныя альбомы разам! Фотаздымкі (не больш за тры) з гісторыяй дасылайце з адпаведнай пазнакай на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а або info@zviazda.by. Найлепшага аўтара чакае прыз. Арыгіналы дасланых фотаздымкаў абавязкова вяртаюцца***

■

# ХУТКА ЧЫТАЦЬ — БОЛЬШ ВЕДАЦЬ?

**Кожны з нас штодня сутыкаецца з вялікай колькасцю інфармацыі. Мы праглядаем навіны ў інтэрнэце, імкнёмся «праглынуць» новы папулярны бестселер, каб хутчэй даведацца ў чым развязка, удумліва ўнікаем у інструкцыю, бо трэба запомніць, як і што рабіць. Напэўна, не існуе такога чалавека, які б за дзень не прачытаў ніводнага сказа. А тыя, хто чытаюць шмат і залпам, непазбежна задумваюцца, як навучыцца гэта рабіць яшчэ хутчэй.**

Аб'явы курсаў хуткага чытання сустракаюцца даволі часта — значыць, попыт на іх ёсць. Як правіла, на занятках абяцаюць не толькі паскорыць тэмп чытання, але і ўсебакова развіць памяць, увагу, мысленне. Праводзяцца яны і для дзяцей, і для дарослых.

Вядома, для вучняў малодшых класаў чытанне — амаль галоўны навык. Калі дзіця дрэнна чытае, гэта адбіваецца на вучобе ў цэлым. Якім чынам курсы хуткага чытання могуць паўплываць на паспяховасць? У пошуках адказу я звярнулася ў адзін са сталічных адукацыйных цэнтраў, які ладзіць заняткі па адпаведным кірунку.

— Цяпер у школьнікаў існуе занадта шмат спакусы, — лічыць **інтэлект-трэнер цэнтра Кацярына САМУСЕВА.** — Тэлевізар, камп'ютар, гульні на планшэтах і ў тэлефонах адцягваюць увагу ад вучобы, не даюць дзіцяці сканцэнтравацца на ведах. Так губляецца цікавасць да кнігі, чытання ўвогуле. Мы дапамагаем адрадзіць інтарэс.

Пры гэтым сярод наведвальнікаў адукацыйнага цэнтра нямала і тых, хто хоча натрэніраваць памяць, каб з лёгкасцю засвойваць школьную праграму.

— Прыходзім на курсы ўжо другі раз, — кажа бацька вучня 4-га класа Аляксея. — У мінулым годзе таксама наведвалі заняткі. Былі ўражаны вынікам. Сын пачаў лепш вучыцца. Хадзілі на курсы і летам, каб пасля доўгага перапынку Лёшу было лягчэй брацца за вучобу.

Навучыць дзяцей хутка чытаць — гэта не асноўная мэта. Кацярына падкрэслівае, што галоўнае, каб дзіця чытала правільна і разумела, аб чым гаворыцца ў тэксце, магло пераказаць яго.

Зазіраю на заняткі да першакласнікаў. Пачынаюць з размінкі — робяць дыхальную і артыкуляцыйную гімнастыкі, чаргуюць іх з чытаннем услых невялічкіх тэкстаў. Потым праверка дамашняга задання, сярод якога і вымаўленне скорагаворак.

— Іншы раз дзеці прыходзяць да нас не з самым вялікім жаданнем, але займаюцца потым усе з задавальненнем, на ўроках у нас не сумна, — кажа Кацярына.

На занятках сапраўды цікава. Вучням прапануюць прачытаць апавяданне на хуткасць, запомніць змест і адказаць на пытанні; знайсці пэўныя літары ў сказах і падкрэсліць; выпісаць маленькія або вялікія літары, каб атрымалася слова; намаляваць тое, пра што гаворыцца ў тэксце і шмат іншага. Зразумела, для старшых класаў заданні больш складаныя.

Адны дзеці спраўляюцца з практыкаваннямі хутка, іншым патрабуецца больш часу. Але праз 5-6 заняткаў ужо можна заўважыць вынік у кожнага. Усяго курс складаецца з 10—15 урокаў працягласцю 1-1,5 гадзіны. Працуюць таксама групы выхаднога дня. Займаюцца па 5—10 чалавек.

Так, з дапамогай, на першы погляд, нескладаных практыкаванняў дзеці навучацца арыентавацца ў тэксце, хутка вылучаць галоўнае і ўлоўліваць сэнс. Акрамя таго, у вучняў відавочна паляпшаецца ўвага, мысленне, вымаўленне.

Натуральна, каб захаваць вынік, трэба працягваць рэгулярна займацца дома. На гэта робіцца акцэнт. І тут ужо ўсё залежыць ад бацькоў. Дарэчы, увесь працэс навучання пабудаваны на ўзаемадзеянні педагог—вучань—бацькі. У апошніх нават ёсць спецыяльныя дапаможнікі, якія змяшчаюць падрабязнае апісанне методык навучання. Пасля кожных заняткаў праводзіцца бацькоўскі сход. Выкладчык расказвае, чаму навучыліся на ўроку, і тлумачыць дамашняе заданне. Дарэчы заданні даволі аб'ёмныя, і каб выканаць іх да наступных заняткаў (а яны ўжо заўтра!) спатрэбіцца не адна гадзіна.


На занятках па хуткім чытанні ў першакласнікаў.

У Цэнтр хуткага чытання звяртаюцца не толькі дашкольнікі і вучні 1—11 класаў. Як адзначыў **дырэктар адукацыйнага цэнтра Ігар ШЫМАНСКІ,** курсы хуткага («вертыкальнага») чытання карыстаюцца вялікім попытам сярод дарослых. Іх, дарэчы, 30% ад усіх навучэнцаў. Звычайна гэта студэнты, якім трэба засвойваць вялікую колькасць вучэбнага матэрыялу, або спецыялісты, чые прафесійныя абавязкі звязаны з апрацоўкай інфармацыі.

Аднак меркаванні аб карысці падобных курсаў для дарослых у тых, хто іх наведваў, разыходзяцца. Адны лічаць, што хуткасць чытання сапраўды павялічваецца, але без рэгулярных трэніровак навык губляецца. Праўда, чытаць «вертыкальна» можна толькі лёгкія тэксты, а ў навуковых або з вялікай колькасцю тэрмінаў, гэты метад не працуе.

Другія сцвярджаюць, што курсы хуткага чытання ўвогуле бессэнсоўныя, хутчэй толькі ствараюць ілюзію поспеху, а не рэальныя дасягненні, бо па меры павелічэння ўзроўню, заданні наўмысна палягчаюцца.

Іншыя кажуць, што вынік залежыць перш за ўсё ад уласных намаганняў і рэгулярных трэніровак, і цудаў чакаць не трэба, бо на курсах толькі знаёмяць з методыкай. Таму навучыцца чытаць старонкамі, а не сказамі, можна і самастойна, калі знайсці спецыяльную літаратуру і пазаймацца.

## Наталля СЯЛЕЦКАЯ, настаўніца пачатковых класаў сталічнай сярэдняй школы №1:

## «КУРСЫ ПАТРЭБНЫ ХУТЧЭЙ БАЦЬКАМ, А НЕ ДЗЕЦЯМ»

— Тэхніка чытання ў першым класе амаль не правяраецца, бо не з'яўляецца паказчыкам ведаў. Галоўнае, каб вучань разумеў, пра што чытаў, мог адказваць на пытанні. Праверыць хуткасць можна хіба толькі, каб выявіць дынаміку. У сувязі з гэтым лічу, што першакласнікам наведваць курсы хуткага чытання няма сэнсу. Больш за тое, хлопчык з майго класа хадзіў на адпаведныя заняткі, але ніякага відавочнага паляпшэння не адбылося, ён па-ранейшаму чытаў слаба.

Да таго ж існуе верагоднасць, што наведванне курсаў можа яшчэ пагоршыць сітуацыю. Дрэннае чытанне для дзіцяці таксама праблема. А калі яго вымушаюць наведваць курсы хуткага чытання на канікулах (дарэчы, так было і ў майго вучня)... У дзіцяці гэта можа выклікаць стрэс. Я раю «адпусціць» сітуацыю. Падчас канікулаў дзіцяці лепш адпачыць, поўнасцю абстрагавацца ад чытання, пераключыцца на тое, што яму даспадобы. Карысці будзе больш. Не ўзводзьце дрэннае чытанне ў абсалют. Рана ці позна дзіця дасягне пэўнага ўзроўню. Дарэчы, сваіх дзяцей на такія курсы я не адправіла б.

Што датычыцца тых, хто чытае добра, але імкнецца навучыцца рабіць гэта яшчэ лепш. Справа індывідуальная. Але трэба разумець, навошта? Настаўнікі, натуральна, не зацікаўлены яшчэ больш паглыбляць розніцу паміж вучнямі.

Іншая справа старшакласнікі, у якіх праграма значна большая. Заняткі на курсах могуць дапамагчы хутчэй спраўляцца з аб'ёмамі літаратуры.

***— Ці можа школа выправіць сітуацыю?***

— Насамрэч у вялікіх класах, дзе вучняў 30 і больш, нельга навучыць усіх чытаць аднолькава добра. У першакласнікаў урок доўжыцца 35 хвілін, лічыце па хвіліне на кожнага. Ва ўсіх дзяцей розныя здольнасці. Як правіла, тыя, хто адразу добра «стартуюць», ужо не паляпшаюць вынік у канцы года, а ў каго спачатку не атрымліваецца, паступова наблізяцца да сярэдняга ўзроўню.

Але выправіць сітуацыю з дрэнным чытаннем магчыма, асабліва калі рабіць гэта ў тандэме з бацькамі. Галоўная задача настаўніка — матываваць, зацікавіць дзіця кнігай. У мяне, напрыклад, на стале заўсёды ляжыць кніга, і на перапынках дзеці бачаць, як я яе часам чытаю. Добра, калі дома чытаюць бацькі. Але разумею на ўласным прыкладзе, што ў чарзе бясконцых клопатаў цяжка знайсці час, каб пачытаць, і часцей за ўсё робіш гэта ўвечары, калі дзеці ўжо ляглі спаць. Але заўсёды прыкметна, калі бацькі цікавяцца літаратурай, а калі ў хаце нават кніжнай палічкі няма. Лічу, няцяжка выкраіць паўгадзіны, каб разам з дзіцем пачытаць цікавае апавяданне.

Існуе шмат методык, якія дапамагаюць заахвоціць да



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

чытання. Напрыклад, я выкарыстоўваю «Гару поспеху». Адпаведна колькасці прачытаных кніг вучань адзначае сябе на пэўным узроўні гары, тым самым паступова падымаецца на яе вяршыню.

Калі дзеці пачынаюць добра чытаць, мы праводзім спаборніцтвы. За кожнае выкананае заданне вучню прысвойваюць значок «машынку». Хто набярэ больш «машынак», той хутчэй апынецца на фінішы. Усе гэтыя «гульні» патрэбны толькі спачатку. Калі вучань адчуе смак чытання, яго захопіць цікавасць да прыгодаў, ніякіх стымулаў ужо не трэба.

***— Чым, на ваш погляд, абумоўлена папулярнасць курсаў хуткага чытання? Няўжо дзецям так цяжка даецца школьная праграма?***

— Сёння існуе даволі значная праблема — гонка за паказчыкамі. Заўсёды здзіўляе фраза бацькоў: «У гэтай настаўніцы высокія паказчыкі. У яе вучняў амаль стапрацэнтнае паступленне ў ВНУ». У пагоні за высокімі паказчыкамі бацькі імкнуцца адправіць дзяцей на курсы ўжо з маленства, а некаторыя нават наймаюць рэпетытараў. І часцей за ўсё гэта трэба менавіта бацькам, а не дзецям. Здаецца, такім чынам яны кампенсуюць пастаянную занятасць і немагчымасць удзяляць дзіцяці час. Хацела б перасцерагчы бацькоў: дадатковыя заняткі або курсы ў першым класе — занадта вялікая нагрузка.

На самай справе, галоўным паказчыкам павінна быць вялікае жаданне дзіцяці наведваць урокі, імкненне атрымліваць веды. Маці майго вучня аднойчы ў разгубленасці пісала мне, што яе сын збіраецца ісці ў школу з тэмпературай 39. Хлопчык тлумачыў, што ў іх будзе цікавы ўрок, і ён не можа яго прапусціць. Вось вам паказчык!

Здзіўляе, што многія вучні і іх бацькі незадаволеныя адсутнасцю адзнак у першым і другім класах, бо становіцца незразумела, якія поспехі ў дзіцяці. На жаль, «дзявятка» ў дзённіку бацькам кажа шмат больш, чым размова з дзіцем аб тым, што новага ён пачуў у школе.

Раней у вучобе акцэнт рабіўся на якасць, глыбіню ведаў, а сёння больш на адзнакі. Лічу, няхай лепш вучань атрымлівае «сямёркі», але ведае, навошта ён вучыцца. Чым у дзённіку будуць адны «дзявяткі», а за імі — нічога, акрамя «вызубранага» ўрока. Увогуле бянтэжыць, што некаторыя бацькі заахвочваюць дзяцей матэрыяльна, плацяць за адзнакі адпаведныя сумы грошай.

***— Як ставіцеся да курсаў хуткага чытання для дарослых?***

— Для дарослых, напэўна, яны апраўданыя. Новыя веды дапамогуць хутка спраўляцца з апрацоўкай вялікай колькасці інфармацыі. Я веру, што нават навуковыя тэксты можна навучыцца чытаць хутка і разумець змест. Сама цяпер вучуся ў аспірантуры і ведаю, наколькі важна ўмець хутка працаваць з інфармацыяй, улоўліваць сэнс. Але відавочна ў далейшым, як любыя іншыя навыкі, калі іх не практыкаваць, здольнасць хутка чытаць можа згубіцца.

**Яна ЛЫЧКОЎСКАЯ.**

# ЯК У РАМАНЕ ДЖЭЙН ОСЦІН



Аднойчы з бальнай супольнасці выдзелілася касцюмная супольнасць. Вынікам гэтага стала выстава рэпрадукцый гістарычных убораў «Куфэрак».

**Яны так і пазнаёміліся — у студыі танцаў. А праз нейкі час самі пачалі выкладаць гэту навуку. Сёння ў студыі гістарычнага танца La Camargo Маргарыта Шаўцова і Уладзіслаў Бяляўскі вучаць сучасных дам і кавалераў крокам, звязкам, фігурам, а таксама тонкасцям этыкету, каб аднойчы яны маглі ўпэўнена выйсці ў свет на першым у жыцці сапраўдным балі.**

## ЗАБАВА ДЛЯ ДАРОСЛЫХ

— Сама я з сям'і гісторыкаў, — расказвае Маргарыта. — Упершыню занялася гістарычнымі танцамі ў студэнцкія гады. Мне проста было цікава і хацелася танцаваць. Ну і, канешне, вабілі прыгожыя сукенкі... Праз некалькі гадоў сяброўка была вымушана адысці ад кіраўніцтва студыяй і запрасіла мяне на сваё месца.

**На такія мерапрыемствы не прыходзяць проста паглядзець. Да балю неабходна рыхтавацца загадзя.**

Сёння ў La Camargo займаюцца дарослыя і падлеткі з 15 гадоў. Дзяцей няма, бо ім складана танцаваць з дарослымі.

— Акрамя таго, мы рэканструюем падзеі мінулага, а ў той час, як вядома, убачыць на балі кагосьці маладзей за 15-16 гадоў было немагчыма. Гэта лічылася забавай для дарослых, — тлумачыць Уладзіслаў.

Сёння ў групах значна больш жанчын. Але часам прыходзяць і сямейныя пары. Дарэчы, ужо праз месяц-паўтара пачаткоўцы могуць наведваць балі. Для гэтага зусім неабавязкова ведаць складаныя фігуры. Як запэўніваюць Маргарыта і Уладзіслаў, сэнс заняткаў у тым, каб чалавек, калі ён прыйдзе на баль, не замінаў ні сабе, ні партнёрам. Некаторыя ў танцах ходзяць — не выкарыстоўваюць складаныя крокі і элементы, некаторыя ўжываюць амаль балетную тэхніку. Наколькі складаны танец чалавек будзе дэманстраваць, каб паказаць сваё мастацтва, — пытанне толькі асабістых пераваг.

Тэхнічна найбольш складаныя — танцы эпохі барока. Менавіта сама эпоха так стваралася, каб быць мудрагелістай і нават вычварнай. Але, як правіла, усе любяць вальсы і кантрдансы. Апошнія — адны з самых простых танцаў, яны прыйшлі да нас з Англіі. Менавіта іх танцавалі героі раманаў Джэйн Осцін. Дамы і кавалеры стаяць у дзве лініі і выконваюць пэўныя фігуры, якія час ад часу паўтараюцца. Любяць кантрдансы за тое, што танцаваць дазваляецца з некалькімі партнёрамі, а падчас танца можна паразмаўляць.

— Калі лічыце, што вучыцца танцаваць трэба ў дзяцінстве, а дарослым застаецца толькі шкадаваць аб страчаных магчымасцях, вы памыляецеся, — усміхаецца Маргарыта. — Многія танцмайстры, падручнікамі якіх мы цяпер карыстаемся, пісалі, што даволі часта да іх прыходзілі менавіта дарослыя вучні. Асабліва гэта тычыцца XIX стагоддзя, калі актыўна пачалі працаваць «сацыяльныя ліфты». У вышэйшае грамадства трапляў чалавек, які ў сілу свайго паходжання не меў неабходнай адукацыі, а яму трэба было стаць «сваім». У тым ліку — танцаваць на балях. Менавіта таму вучыцца танцаваць у 20—25 гадоў было цалкам нармальна. Але вядома, у сем'ях, якія мелі грошы і статус у грамадстве, танцы былі часткай адукацыі з дзяцінства.

## ДЭФІЦЫТ КАВАЛЕРАЎ

Акрамя навучання танцам, Маргарыта і Уладзіслаў арганізоўваюць рэканструктарскія балі — у адрэстаўраваных гістарычных сядзібах ці ў больш сціплых сучасных залах тэатраў. У Беларусі няшмат месцаў, у якіх сапраўды можна арганізаваць баль, але ў асобныя гады намаганнямі розных студый танцоры здолелі патрапіць нават у Нясвіжскі палац. Сёлета La Camargo плануе мерапрыемствы ў шляхецкай сядзібе, а калі ўсё складзецца найлепшым чынам — то нават у Новым замку ў Гродне.

На такія мерапрыемствы не прыходзяць проста паглядзець. Да балю неабходна рыхтавацца загадзя: некаторыя танцы выканаць «не ў тых» уборах проста немагчыма, таму вам абавязкова спатрэбіцца адпаведны эпосе касцюм. Напрыклад, калі ў дамы сукенка з адкрытымі плячыма, яна не можа высока падняць рукі.

— Мы ж у сваю чаргу рыхтуем танцавальную праграму — тыя танцы, якія былі папулярныя ў пэўны гістарычны перыяд, — расказвае Уладзіслаў. — Па магчымасці стараемся праводзіць балі пад жывую музыку. Гэта значна больш атмасферна, чым аўдыязапісы.



Кавалеры ў фраках — прадмет асаблівага захаплення для жанчын.

У сярэднім балі цягнуцца 4—5 гадзін. Як правіла, мерапрыемства разбіваецца на аддзяленні, паміж якімі ёсць перапынкі, каб усе маглі адпачыць, сфатаграфавацца. У адрозненне ад баляў мінулых стагоддзяў фотасесія — неад'емная частка сучаснага балю. Спецыяльныя фотазоны выносяцца за межы бальнай залы, каб не замінаць іншым гасцям.

На жаль, сёння жанчын на балях таксама больш, чым мужчын. Але, як гаворыць Маргарыта, можна арганізоўваць мерапрыемствы такім чынам, каб абмяжоўваць дыспрапорцыю паміж кавалерамі і дамамі:

— Мы прымаем заяўкі ад усіх пар, а далей, зыходзячы з ліку дам без суправаджэння кавалераў, разбіваем іх па наступным прынцыпе: адна дама — на дзве або тры пары. Але некаторыя арганізатары так не робяць і прымаюць заяўкі ад усіх. З іх пункту гледжання, абмяжоўваць даму ў задавальненні наведаць баль толькі таму, што ў яе няма кавалера, недапушчальна. З-за гэтага можа ўзнікнуць сітуацыя, калі на мерапрыемства прыедзе 10 мужчын і 30 жанчын. Ва ўмовах дэфіцыту кавалераў пазнаёміцца з кімсьці на балі тэхнічна складана, але даволі шмат пар з'яўляецца менавіта так.

**У другой палове XVIII стагоддзя і да самых падзелаў Рэчы Паспалітай, калі ёю правіў кароль Станіслаў Аўгуст Панятоўскі, які вельмі захапляўся еўрапейскай і асабліва французскай культурай, на нашых землях праводзіліся еўрапейскага тыпу балі. А «польскія» танцы ў сваю чаргу пранікалі ў Еўропу: менавіта ў канцы XVIII стагоддзя ў бальных залах з'явіліся паланэз і мазурка. Пазней, у XIX стагоддзі, мазурка стане абавязковай часткай бальнай праграмы і доўгі час будзе лічыцца больш рамантычнай і інтымнай, чым нават вальс: менавіта падчас мазуркі можна было асабліва ўдала фліртаваць. Існаваў і выраз «мазурачная балбатня», што азначала флірт падчас гэтага танца.**



Маргарыта і Уладзіслаў (*крайнія злева*).

## СУКЕНКА МАРЫ

Як высветлілася, уборы для дам — яшчэ больш балючае пытанне, чым дэфіцыт кавалераў. Так, сукенку можна пашыць самой. Гэта найбольш бюджэтны варыянт, але ён вымагае даволі вялікіх выдаткаў часу. І не кожная жанчына валодае тымі навыкамі шыцця, каб здолець пашыць сабе яе ад пачатку і да канца. Другі варыянт — замовіць строй у швачак, якія спецыялізуюцца на рэканструктарскіх бальных уборах.

— Гэта здаецца складаным, але ўсё значна прасцей і падобна да таго, як мы выбіраем паўсядзённае адзенне. Бо дама ўсё роўна аддасць перавагу сукенцы таго колеру, які ёй пасуе, і абярэ дэкальтэ, якое не будзе супярэчыць яе ўяўленням пра дапушчальнае. Па вялікім рахунку гэта ўсяго толькі яшчэ адна непрактычная сукенка ў шафе, — смяецца Маргарыта.

— Як ні дзіўна, у мужчын усё значна больш складана. Кавалеры ў фраках — гэта прадмет асаблівага захаплення. Але знайсці добрага краўца, які сшые фрак, на жаль, цяжэй, бо гэта тэхнічна не так проста, як з сукенкамі.

Асаблівая ўвага ўдзяляецца абутку. Каб лёгка танцаваць некалькі гадзін запар і пры гэтым не сапсаваць паркетную падлогу, выкарыстоўваецца мяккі абутак на скураной падэшве — часцей за ўсё танцавальны, але некаторыя франты знаходзяць магчымасць заказаць сапраўдныя рэканструяваныя пантофлі. Такі абутак дазваляе назе гнуцца, не абцяжарвае яе. Скажам, калі вы выпадкова наступіце на нагу партнёра, яму будзе не так балюча.

**Перапіска з Віктарам Гюго лічылася больш прыстойнай, чым перапіска з бедным французскім студэнтам.**

— Сярод дам-рэканструктараў ёсць жарты пра дашыванне сукенкі ў ноч перад балем. У мяне таксама бывала. Перад адным з баляў я не паспявала як след ушыць рукавы сукенкі і прыфастрыгавала іх на жывую нітку. І канешне ж, у самы адказны момант, ужо падчас вальса, я пачула нечаканы трэск. Было жудасна няёмка! Дарэчы, Улад зрабіў з гэтага свае высновы: калі я не паспявала пашыць наступную сукенку, ён гераічна змагаўся з ніткамі і іголкамі да глыбокай ночы. І вось гэты ўбор мы агульнымі сіламі скончылі ў тэрмін.

З цягам часу з нашай бальнай супольнасці выдзелілася касцюмная супольнасць. Вынікам гэтага нашага захаплення стала выстава рэпрадукцый гістарычных касцюмаў, якія мы шыем самі, — «Куфэрак». Пачыналася ўсё з таго, што вельмі хацелася знайсці падставу пашыць пабольш цікавых нябальных сукенак, а перарасло ўсё ў маштабны адукацыйны праект.

## РЭПУТАЦЫЯ — ПЕРШ ЗА ЎСЁ

Вядома, цяпер адносіны паміж жанчынай і мужчынам больш свабодныя, чым некалькі стагоддзяў таму. Змяніўся і этыкет зносін.

— На мой погляд, — гаворыць Маргарыта, — адносіны паміж людзьмі супрацьлеглага полу, скажам, два стагоддзі таму былі больш вытанчанымі, аднак цяперашнія мне здаюцца больш здаровымі. Чым больш жорсткія правілы этыкету, тым часцей гучыць у галаве фраза «што пра мяне падумаюць», тым больш маніпуляцый у адносінах, тым складаней проста размаўляць адно з адным. Калі дама і кавалер вымушаны іграць у жыцці нейкія ролі, пры гэтым ім яшчэ трэба неяк адно аднаго пазнаваць (калі ў перспектыве жаніцьба), то вось у гэтым і ёсць праблемы. І літаратура гэта пацвярджае. Тыповы сюжэт, калі пара ўзяла шлюб, і выпадкова аказваецца, што кожны з іх зусім іншы чалавек.

Што тычыцца этыкету на балях, то дама ніколі не запрашае кавалера на танец. Але можна зрабіць тонкі намёк: выпусціць хустачку, падманіць кавалера веерам ці проста «страляць» вочкамі. Так, гэты ход быў прыдуманы значна раней, чым мы думаем. На самай справе кавалеры выдатна разумеюць, што баль — гэта месца для танцаў. І калі мужчына не памірае ад стомы і ведае танец, то ў дзевяці выпадках з дзесяці ён запросіць даму.

Ёсць такі момант у бальнай этыцы — папярэдняе запрашэнне на танец, калі кавалер загадзя дамаўляецца з дамай і запісвае гэта ў бальную кніжачку, каб не забыцца. На маім дэбютным балі адзін кавалер запрасіў мяне на мазурку. Але я яму адмовіла, бо ў мяне ўжо быў партнёр. А ён зусім забыўся зверыцца са сваімі запісамі і запрасіў іншую даму. Я была такая раз'юшаная, што зламала аб гэтага кавалера веер.

Балі — гэта выдатная магчымасць пагутарыць з людзьмі. Але я не сказала б, што цяпер мы маем менш зносін, чым некалькі стагоддзяў таму. Наадварот — нават больш дзякуючы інтэрнэту. Да таго ж у мінулым былі даволі жорсткія правілы перапіскі. Асабліва гэта тычылася жанчын. Напрыклад, дзяўчына ніколі не павінна была пісаць мужчыне — гэта знішчала яе рэпутацыю. Нават замужняя дама магла напісаць ліст мужчыну толькі калі ён яе сваяк або, напрыклад, знакамітасць. Зразумела, перапіска з Віктарам Гюго лічылася больш прыстойнай, чым перапіска з бедным французскім студэнтам.

**Ганна БАГІНО.** *bahino@zviazda.by*
**Фота з архіва герояў.**

# «Дзеці не павінны быць важнейшымі за мужа»



## «Маме вельмі важна знайсці час для сябе»

***— Як нарадзілася ідэя зрабіць каляндар «Супер-мамы»?***

**Г.:** Да нараджэння Ладушкі мне хапала двух нататнікаў: у адным былі малюнкі, у другім — планы, сустрэчы. Калі я стала мамай, зразумела, што, каб усё паспець, увесь месяц у мяне павінен быць перад вачыма. Вельмі доўга шукала каляндар зручнага фармату. Але так і не знайшла. Дэкаратыўных календароў, дзе зверху вялікі малюнак, а знізу — лічбы на ўсю клетачку, шмат. Для мяне ж важна, каб ён быў не толькі прыгожы, але і функцыянальны. Таму расчарціла на вялікія клеткі аркуш ватману фарматам А2 і павесіла на сцяну. Цэлы месяц запісвала туды свае справы. Але ў рэшце рэшт пачуццё эстэтыкі перамагло, і я звярсталa першую старонку календара... Мне гэта дапамагло. І я падумала, што такая штука патрэбна ўсім мамам.

***— А ці карыстаецца Сяргей сямейным календаром?***

**С.:** Я кажу Ані, што ў мяне футбол, напрыклад, у пятніцу а дзясятай вечара, і яна ўлічвае гэта, калі складае план на тыдзень. Асабіста мне каляндар дапамагае зразумець, што і калі мы робім сям'ёй.

**Г.:** Сяргей туды нічога не ўпісвае.

**С.:** Ну, часам.

**Г.:** Але вельмі рэдка *(смяецца)*. Гэта каляндар для супер-мамы, таму я яго і вяду. У мяне ёсць шматдзетныя сяброўкі, дык там і старэйшыя дзеці запаўняюць каляндар, у іх нават фламастар свайго колеру. Яны запісваюць гурткі, дні нараджэння сяброў, каб мама ведала, калі трэба падрыхтаваць падарунак. У мяне ж каляндар больш для сваіх спраў. Бо дачцэ зараз два з паловай, і ў яе асабліва сваіх спраў няма *(смяецца)*. Я наўмысна рабіла вялікія клеткі, каб шмат усяго можна было запісаць. Мне, як занятай маме, якая хоча і памаляваць, і з сяброўкамі пабачыцца, і спортам заняцца, і банальна на манікюр схадзіць, трэба планаваць дні, каб усё паспець. У каляндар уваходзіць 180 налепачак, каб візуалізаваць свае планы. Напрыклад, запланавалі з мужам паход на канцэрт — клею ноткі, дзень нараджэння ў добрай знаёмай — торцік са свечкамі, трэба звадзіць дзіця да доктара — дзядзьку ў белым халаце. Я ў каляндар упісваю не толькі свае справы, але яшчэ дасягненні Ладкі: першую машынку намалявала, сказала нейкую цікавую фразу... Таму гэта ўжо не проста каляндар, а больш як сямейны дзённік падзей атрымліваецца, які можна пасля захоўваць, як частку сямейнай гісторыі.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

***— Ведаю шмат маладых мам, якія «раствараюцца» ў дзіцяці. У іх няма часу нават выспацца нармальна, а ты кажаш пра манікюр і сустрэчу з сяброўкамі...***

**Г.:** Усе мамы розныя. Асабіста мне пасля нараджэння Ладкі яшчэ больш хочацца маляваць. Хоць, сапраўды, катастрафічна не хапае часу. Але, калі ёсць жаданне, час заўсёды можна знайсці. Іншая справа, што некаторым мамам абсалютна камфортна «раствварыцца» ў дзіцяці. Вось толькі наколькі камфортна гэта тату? Ён прызвычаіўся, што жонка для яго, а цяпер яе няма, бо яна цалкам для дзіцяці. Гэта праблема. Хоць ёсць жанчыны, для якіх гэта не праблема, бо, калі ў іх раней не было хобі, у якое душу ўкладвалі, то дзіця лёгка займае гэта месца — і жанчына пачынае адчуваць сябе цалкам камфортна. Некаторыя мамы кажуць: "Я нават не ўяўляю, як без яго жыла». Але мой каляндар хутчэй за ўсё для актыўных матуляў, у якіх рознабаковае, насычанае жыццё. Калі б гэта быў каляндар вакол дзіцяці, ён бы ўтрымліваў такія налепкі, як, напрыклад, пакарміць з бутэлечкі, памяняць падгузкі. А ў мяне ўсе налепкі тычацца мамы. Бо маме вельмі важна знайсці ў стане цэйтноту час для сябе. Ёсць такая прымаўка: «Дзіця сыдзе, а муж застанецца». Таму трэба максімальна знаходзіць час і для каханага. У календары ёсць налепкі ў выглядзе сардэчка — рамантычная вячэра з мужам. Пра гэта таксама нельга забываць.

***— І як часта такая налепка з'яўляецца ў вашым сямейным календары?***

**Г.:** Стараюся *(усміхаецца і пазірае на Сяргея)*.

**С.:** Я згодны з Аняй. Дзіця не павінна быць галоўным. Галоўнымі павінны быць тата і мама, адносіны паміж імі. Калі ж дзіця выходзіць на першае месца, то, як правіла, адносіны цярпяць.

**Г.:** Калі шчаслівыя бацькі, то і дзіця таксама будзе шчаслівым. Мы, напрыклад, гадуем дачку па сістэме «ціхая ноч». Яна заснавана на дакладным рэжыме і разлічана на занятых бацькоў, для якіх важны ў першую чаргу іх душэўны стан. Магчыма, гэта будзе цынічна гучаць, але спачатку бацькі павінны выспацца. Дзіцяці не патрэбна стомленая і злая мама, якая не выспалася і злуецца, што з мужам пасварылася.

## «Сяргей — галава, а я — рукі»

***— Першы каляндар для супер-мам быў на рускай мове. Чаму на 2017 год вырашылі зрабіць яго беларускамоўным?***

**Г.:** Мы практычна ўсе нашы паштоўкі робім на беларускай мове. Адчуваем, што так правільна. Мы ж беларусы. Хоць і размаўляем па-руску, але любім беларускую мову. Па-першае, яна мілагучная. Па-другое, мне самой яе хочацца падвучыцца. Я цяпер актыўна займаюся вывучэннем гісторыі Брэста. Наогул, важна ведаць свае карані, гісторыю сваёй сям'і, горада, краіны, мовы. Файна, што гэта становіцца трэндам. Магчыма, мы яго і робім — трэнд на беларускамоўныя паштоўкі.

**С.:** Цяпер рускамоўных і англамоўных паштовак поўна і імі нікога не здзівіш. Якасных жа паштовак на беларускай мове, калі мы пачалі іх выпускаць, практычна не было. Мы былі адны з першых.

**Г.:** Мы раней займаліся яшчэ і адзеннем. Я малявала прынты на майкі з Радзівілам, Купалам, Багдановічам... Першая партыя разышлася вельмі хутка, але мы практычна нічога не зарабілі. А ўсё таму што набывалі тканіну і шылі майкі па ўласным дызайне. Канешне, прасцей было купіць гатовыя і нанесці прынты. Але мы не шукаем лёгкіх шляхоў. Магчыма, пазней вернемся да гэтай тэмы...

**С.:** Амаль усё, што зарабляем на паштоўках, укладваем у справу. Эксперыментуем з паперай, тканінай. Хочам, каб было не толькі стылёва, арыгінальна, але і якасна. Хочам надаць нейкай эстэтычнасці нашай беларускасці. Каб беларус лічыў, што беларусам быць выдатна. І не толькі беларус. Ва ўсім свеце ведаюць і любяць рэчы «IKEA». Гэтая мегапаспяховая карпарацыя ў ручніках, дыванах выкарыстоўвае свае нацыянальныя ўзоры. І прыемныя, якасныя рэчы ты пачынаеш асацыяваць са шведскім фальклорам. І пачынаеш яго любіць. Мы таксама мусім ствараць якасныя рэчы і туды дадаваць беларускі фальклор, бо ён неверагодны!



***— Ёсць планы ператварыць сямейнае хобі ў асноўную дзейнасць?***

**Г.:** Я — мама ў дэкрэце, Сяргей — вэб-распрацоўшчык. Цяпер нашу сям'ю корміць заробак мужа. «Важны гусак» вельмі вялікіх грошай пакуль не прыносіць.

**С.:** Насамрэч зарабляць можна і на дробязях. Паштоўкі патрэбныя — людзі нараджаюцца, святкуюць дні нараджэння, вяселлі. Гэта можна зрабіць паспяховым бізнесам, але трэба быць цярплівым і мець густ.

***— Як нарадзіўся сямейны праект?***

**Г.:** Наспела крытычная маса маіх малюнкаў, нейкі выхлап павінен быў з'явіцца. Бо абмяжоўвацца лайкамі ў сацыяльных сетках, вядома, прыемна... Але што далей? Што можна з малюнкам зрабіць? Самае простае — надрукаваць паштоўку. Пасля мы ўжо даведаліся, наколькі гэта няпроста. Каб надрукаваць свой малюнак і выдаваць легальна паштоўку, патрэбна ліцэнзія выдаўца... Усім гэтым займаўся Сяргей. Я ж толькі малюю, вельмі шмат прыдумваю. У мяне муж — фільтр, які адбірае работы для паштовак.

***— І ты з ім пагаджаешся?***

**Г.:** Канешне, у нас узаемная згода. Насамрэч, што тычыцца паштовак, то Сяргей вельмі часта выступае генератарам ідэй. Ён — галава, а я — яго рукі. Менавіта, Сяргей прыдумаў універсальную паштоўку. Там пералічаны словы — «мілай, дарагой, любімай...», «маме, дзядулі, бабулі...», «з днём народзінаў, 8 сакавіка, 23 лютага...», — і застаецца толькі падкрэсліць патрэбныя. Калі б я малявала паштоўкі, яны б былі з сардэчкамі, зайчыкамі, якія абдымаюць адно аднаго... А ў тандэме з мужам атрымліваюцца вельмі вясёлыя: з надпісам «Супакойся ды працягвай», са станікам у выглядзе васьмёркі, а побач — збянтэжаны кот...

***— Мне вельмі падабаецца ваша паштоўка з гусакам на веласіпедзе з надпісам «Жыві з асалодай». Яна неяк звязана з назвай сямейнага брэнда?***

**Г.:** Муж сябе жартам называе важным гусаком *(смяецца)*. Пачалося ўсё з таго, што я падарыла Сяргею на дзень нараджэння ілюстрацыю вялікага фармату з гусаком на ровары. Яна так яму спадабалася, што прапанаваў надрукаваць паштоўку. Назвалі ж так свой сямейны праект, бо любім рабіць якасныя рэчы з добрым пачуццём гумару. Выраз «Важны гусак» — гэта жарт з людзей (і ў першую чаргу з саміх сябе), якія спрабуюць падавацца больш значнымі, чым ёсць на самай справе.

> **«Некаторым мамам абсалютна камфортна «раствварыцца» ў дзіцяці. Вось толькі наколькі камфортна гэта тату?»**

***— А сябрам любіце дарыць свае работы?***

**С.:** Усё і атрымалася менавіта з жадання падарыць. Яшчэ да «Важнага гусака» мы з Аняй прыдумвалі паштоўкі для кожнага сябра на ўсе святы.

## «Клейце самыя танныя шпалеры — няхай дзеці самавыяўляюцца»

***— Калі ўсё паспяваеце: і на рабоце, і з дзіцем упраўляцца, і «Гусаком» займацца?***

**Г.:** Наш праект — гэта альтэрнатыва тэлевізару. Хтосьці глядзіць тэлевізар увечары, а мы займаемся «Гусаком» *(смяюцца)*. Пару гадоў таму мне пашчасціла трапіць у экспедыцыю па Маскве, якую ладзіў дызайнер Арцемій Лебедзеў. Гэта быў вельмі круты эксперымент. Мы кожны дзень наведвалі як мінімум 4 месцы: напрыклад, метро, вежу федэрацыі, кватэру з 50 кошкамі, рэстаран у цемры, дзе трэба есці пры выключаным святле. Потым вярталася ў гасцініцу і малюеш па ўсіх гэтых падзеях карціну. Тая экспедыцыя цалкам змяніла маё адчуванне сябе. Да паездкі я працавала на фірме распрацоўшчыкаў камп'ютарных гульняў для смартфонаў. Калі вярнулася, зразумела, што хачу маляваць не так, як патрэбна заказчыку, а так, як хочацца мне.

***— Ты аматарка камп'ютарных гульняў?***

**Г.:** Не *(смяецца)*, я іх проста малявала, бо за гэта добрыя грошы плацілі. Не разумею, як можна марнаваць час на камп'ютарныя гульні, калі вакол столькі цікавага: можна пакатацца на веласіпедах, памаляваць...

***— А дачка ў творчы працэс не ўмешваецца? Сцены ў доме не спрабуе ўпрыгожыць?***

**Г.:** Канешне, упрыгожвае. Нічога, паклеім наноў, гэта ж дзіця. Нам з Машай мама таксама дазваляла маляваць на сценах, і мы ёй вельмі ўдзячныя за гэты плюсік у развіцці. Таму раю бацькам: клейце самыя танныя шпалеры, няхай дзеці самавыяўляюцца.

***— Маша — гэта твая сястра?***

**Г.:** Так, мы блізняты. Маша таксама мастачка. Цяпер яна ў Грэцыі. Малюе фільм пра Ван Гога. У іх, па задуме польскага рэжысёра, кожны кадр павінен быць намаляваны алеем. У тым міжнародным праекце ўдзельнічае 100 мастакоў з усяго свету.

***— Хочаце, каб ваша дачка таксама стала мастачкай?***

**Г.:** Мы ніякіх планаў наконт Лады не маем. Проста прапануем розныя варыянты баўлення вольнага часу, каб яна ўсё паспрабавала. Што спадабаецца, тым і будзе займацца. Пакуль што ёй цікавыя толькі машынкі і маляваць. Напэўна, усё ж такі аказвае ўплыў мой стыль жыцця. Я хаджу на выставы. Таму не дзіўна, што Ладка адчувае сябе ў брэсцкай выставачнай зале як рыба ў вадзе. Упершыню дачушка пайшла са мной на выставу ў калясцы, калі ёй быў усяго месяц. І сення яна ўжо ў колерах лепш за Сяргея разбіраецца: без праблем адрозніць малінавы ад ружовага, бэзавы ад фіялетавага.

***— А як бавіце час утрaіх?***

**Г.:** У нас ёсць сямейная традыцыя — дзень сям'і: у суботу мы вельмі рэдка снедаем дома. Звычайна ўтраіх ідзём у кавярню, ядзім, напрыклад, сырнікі з какавай, а пасля гуляем па горадзе. Пакуль на вуліцы было цёпла, пастаянна каталіся на веласіпедах. Ладка ў нас з аднаго года — у веласіпедным крэсле. Звычайна, як толькі муж прыйшоў з работы, мы ўсёй сям'ёй едзем у парк, на набярэжную ці на вуліцу Савецкую марожанага паесці. Не трымаем дачку ў «цяпліцы». Стараемся як мага часцей кудысьці вывозіць з дому, новых людзей ёй паказваць. Мы часта вандруем з Ладай па Беларусі, наведваем фестывалі, канцэрты, замкі. Разумеем, чым больш яна ўбачыць, тым больш развітой асобай вырасце, будзе больш шырока ўспрымаць свет.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**
*nadzieja@zviazda.by*
**Фота з сямейнага архіва герояў.**

# ИЗВЕЩЕНИЕ

## о проведении аукциона на право заключения договоров аренды земельных участков Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» *30 ноября 2016 года* проводит открытый аукцион на право заключения договоров аренды земельных участков в Минском районе

**Вид аукциона:** открытый (на повышение начальной цены). Предмет аукциона: право заключения договора аренды земельного участка. Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.

| | | Лот 1 | Лот 2 | Лот 3 | Лот 4 | Лот 5 |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Адрес земельного участка | Минский район, Михановичский с/с, д. Михановичи, участок № 45 | Минский район, Михановичский с/с, д. Михановичи, участок № 48 | Минский район, Михановичский с/с, д. Михановичи, участок № 54 | Минский район, Михановичский с/с, д. Михановичи, участок № 55 | Минский район, Михановичский с/с, д. Михановичи, участок № 58 |
| 2 | Кадастровый номер | 623684204101000210 | 623684204101000209 | 623684204101000203 | 623684204101000208 | 623684204101000207 |
| 3 | Площадь земельного участка, га | 0,1036 | 0,0982 | 0,1083 | 0,1053 | 0,1011 |
| 4 | Срок аренды (лет) | 99 | 99 | 99 | 99 | 99 |
| 5 | Целевое назначение | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома |
| 6 | Инженерная инфраструктура * | --- | --- | --- | --- | --- |
| 7 | Условия, предусмотренные в решении местного органа власти об изъятии земельного участка для проведения аукциона и иные условия аукциона | --- | --- | --- | --- | --- |
| 8 | Расходы по подготовке документации (руб.) | 1 670,45 | 1 670,45 | 1 670,45 | 1 670,45 | 1 670,45 |
| 9 | Начальная цена права заключения договора аренды (руб.) (в денежных единицах 2000 года, руб.) | 3 209,92 (32 099 200) | 3 042,61 (30 426 100) | 3 355,54 (33 555 400) | 3 262,59 (32 625 900) | 3 132,46 (31 324 600) |
| 10 | Задаток (руб.) | 641,00 | 608,00 | 671,00 | 652,00 | 626,00 |
| 11 | Ограничения (обременения) прав на земельный участок | Водоохранная зона реки Свислочь | Водоохранная зона реки Свислочь | Водоохранная зона реки Свислочь | Водоохранная зона реки Свислочь | Водоохранная зона реки Свислочь |

| | | Лот 6 | Лот 7 | Лот 8 | Лот 9 | Лот 10 |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Адрес земельного участка | Минский район, Михановичский с/с, д. Михановичи, участок № 59 | Минский район, Михановичский с/с, д. Михановичи, участок № 60 | Минский район, Михановичский с/с, д. Михановичи, участок № 61 | Минский район, Михановичский с/с, д. Михановичи, участок № 65 | Минский район, Михановичский с/с, д. Михановичи, участок № 66 |
| 2 | Кадастровый номер | 623684204101000206 | 623684204101000205 | 623684204101000204 | 623684204101000212 | 623684204101000211 |
| 3 | Площадь земельного участка, га | 0,1025 | 0,1046 | 0,1067 | 0,1003 | 0,1071 |
| 4 | Срок аренды (лет) | 99 | 99 | 99 | 99 | 99 |
| 5 | Целевое назначение | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома |
| 6 | Инженерная инфраструктура * | --- | --- | --- | --- | --- |
| 7 | Условия, предусмотренные в решении местного органа власти об изъятии земельного участка для проведения аукциона и иные условия аукциона | --- | --- | --- | --- | --- |
| 8 | Расходы по подготовке документации (руб.) | 1 670,45 | 1 670,45 | 1 670,45 | 1 670,45 | 1 670,45 |
| 9 | Начальная цена права заключения договора аренды (руб.) (в денежных единицах 2000 года, руб.) | 3 175,84 (31 758 400) | 3 240,90 (32 409 000) | 3 305,97 (33 059 700) | 3 107,67 (31 076 700) | 3 318,36 (33 183 600) |
| 10 | Задаток (руб.) | 635,00 | 648,00 | 661,00 | 621,00 | 663,00 |
| 11 | Ограничения (обременения) прав на земельный участок | Водоохранная зона реки Свислочь | Водоохранная зона реки Свислочь | Водоохранная зона реки Свислочь | Водоохранная зона реки Свислочь | Водоохранная зона реки Свислочь |

* в разделе «инженерная инфраструктура» указаны коммуникации, которые имеются в данном населенном пункте. Подключение к указанным коммуникациям возможно только в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выдаваемыми эксплуатирующими и согласующими организациями.

**Аукцион состоится *30 ноября 2016 года* в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5.**

Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 320 по 24 ноября 2016 г. включительно в рабочие дни с 08.30 до 17.00.

Контактный телефон: + 375 (17) 205-46-61.

Задатки перечисляются не позднее 24 ноября 2016 г. на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Для участия в аукционе необходимо:

**внести задаток (задатки) не позднее 24 ноября 2016 г.** в вышеуказанном (графа 10 таблицы) размере (в случае участия в торгах в отношении нескольких земельных участков – задаток вносится для каждого из предметов аукциона);

**представить в Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» – организатору аукциона следующие документы:**

заявление на участие в аукционе;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков), с отметкой банка;

подписанное соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, в соответствии с которым победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на внесение платы за право заключения договора аренды земельного участка в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5%, обязан возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения;

**дополнительно представляется:**

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся, до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка обязан:

– внести плату за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения);

– возместить Минскому райисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;

– выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона;

– возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. **Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись и оплачивается по предоставляемому организатором аукциона счету-фактуре.**

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, местный исполнительный комитет на основании решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона и протокола о результатах аукциона либо протокола о признании аукциона несостоявшимся, заключает с победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона договор аренды земельного участка.

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. По заявлению победителя аукциона Минский райисполком предоставляет рассрочку внесения платы за предмет аукциона. Указанное заявление подается победителем аукциона в Минский райисполком не позднее одного рабочего дня после утверждения протокола о результатах аукциона.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона (в предусмотренных законодательством случаях) в течение 6 месяцев со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство объекта должен приступить к занятию земельного участка (начать строительство – осуществление строительно-монтажных работ в соответствии с утвержденной проектной документацией) в соответствии с целью и условиями его предоставления. В случае невыполнения данного требования право пользования (аренды) земельного участка прекращается в установленном порядке.

После истечения срока аренды земельного участка, предоставленного по результатам аукциона, лицо, которому он предоставлен, в установленном порядке обращается в адрес Минского райисполкома с заявлением о продлении срока аренды соответствующего участка (заключении нового договора аренды), на основании которого по решению исполкома ему предоставляется земельный участок на указанный в заявлении срок, но не более чем на 99 лет, при условии внесения этим лицом платы за право аренды земельного участка, рассчитанной на основании его кадастровой стоимости с применением коэффициентов, установленных Советом Министров Республики Беларусь исходя из сроков аренды земельных участков.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с землеустроительной документацией по соответствующим земельным участкам. Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

## Информационное сообщение о проведении аукциона по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в г. Смолевичи

| | | |
|---|---|---|
| 1 | Форма проведения аукциона | Открытый |
| 2 | Дата, время и место проведения аукциона | г. Смолевичи, ул. Советская, 125. Смолевичский райисполком, зал заседаний, 29.11.2016 г. в 15.00 |
| 3 | Продавец и его адрес | г. Смолевичи, ул. Советская, 125, Смолевичский райисполком |
| 4 | Земельный участок, его кадастровый номер и адрес | Лот № 1 – площадь 0,1500 га, кадастровый номер 624850100008000105 г. Смолевичи, ул. М.Богдановича, 3<br>Лот № 2 – площадь 0,1500 га, кадастровый номер 624850100008000036 г. Смолевичи, ул. И.Шамякина, 3<br>Лот № 3 – площадь 0,1500 га, кадастровый номер 624850100008000041 г. Смолевичи, ул. И.Шамякина, 23<br>Лот № 4 – площадь 0,0745, кадастровый номер 624850100003001047 г. Смолевичи, ул. Советская, 71<br>Лот № 5 – площадь 0,1499 га, кадастровый номер 624850100001000978 г. Смолевичи, ул. Гоголя, 17 |
| 5 | Условия продажи | Без изменения целевого назначения |
| 6 | Целевое назначение земельного участка | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, для коллективного садоводства |
| 7 | Начальная стартовая цена | Лот № 1 – 15 000 рублей<br>Лот № 2 – 15 000 рублей<br>Лот № 3 – 15 000 рублей<br>Лот № 4 – 10 000 рублей<br>Лот № 5 – 12 000 рублей |
| 8 | Условия аукциона | А) продажа по цене не ниже начальной<br>Б) участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории республики или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь<br>В) наличие не менее двух участников<br>Г) без права предоставления рассрочки |
| 9 | Наличие инженерной инфраструктуры | Лот №1 – электроснабжение<br>Лот №2 – электроснабжение<br>Лот №3 – электроснабжение<br>Лот №4 – возможность подключения водоснабжения и электроснабжения<br>Лот №5 – возможность подключения газоснабжения и электроснабжения |
| 10 | Условия оплаты | За безналичный расчет в течение 10-ти рабочих дней со дня подписания протокола по результатам проведения аукциона |
| 11 | Сумма задатка и реквизиты продавца | 10% от начальной стартовой цены на р/с 3641000000205 ЦБУ 621 филиала № 616 АСБ «Беларусбанк», г. Жодино, код 812 УНП 600014139 ОКПУ 04064735, назначение платежа 04002<br>(с пометкой «задаток за земельный участок») |

**Расходы по организации и проведению аукциона: лот №1 – 182 руб. 11 коп., лот № 2 – 56 руб. 40 коп., лот № 3 – 88 руб. 20 коп. № 4 – 1552 руб. 59 коп., № 5 – 1444 руб. 34 коп., затраты на публикацию и размещение в сети Интернет информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона.**

**Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются ежедневно в рабочие дни по адресу: г.Смолевичи, ул. Подлесная, д.11, каб. № 9**

**Окончательный срок приема заявлений – 23.11.2016 г. 17.00.**

Контактный телефон (8-01776) 5-53-42, 5-52-65.

Для участия в аукционе в адрес продавца необходимо представить:

– заявление на участие в аукционе по установленной форме;

– документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков);

– физическим лицам – документ, удостоверяющий личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица, и доверенность, заверенную нотариально (в случае, если интересы покупателя представляет это лицо).

## Объявление о торгах

| | |
|---|---|
| Наименование (описание), местонахождение и стоимость имущества | Лот №1. Гараж, расположенный по адресу: ул. Сорокина, ГПК «Сигнал» гараж № 578, г. Барань Витебской области<br>Первоначальная стоимость – 4 500 рублей. |
| Собственник (владелец) имущества | Шпак Анатолий Алексеевич |
| Местонахождение (адрес) имущества | ул. Сорокина, ГПК «Сигнал» гараж № 578, г. Барань, Витебская область |
| Информация об обременениях | Обременений нет |
| Место (адрес), дата и время проведения торгов | г. Орша, ул. Островского, 36, каб. 10<br>15 ноября 2016 года в 11.00 |
| Справочная информация | Отдел принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши<br>211030, г. Орша, ул. Островского, 36<br>Судебный исполнитель – Федоненкова Наталья Сергеевна,<br>тел. 80216543208, моб. 8(033) 3998311 |
| Условия и порядок проведения торгов | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по данному лоту) на депозитный счет отдела принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши № 3642903000794 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 647, УНП 30002505, не позднее 11.00 14.11.2016г.<br>Минимальная величина первого шага – 5% стоимости лота.<br>В соответствии со ст. 516 ГПК Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |

## Наблюдательный совет ОАО «Белхозторг» извещает о созыве внеочередного общего собрания акционеров Общества. Собрание состоится 10 ноября 2016 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Платонова. 34, к. 401 (4-й этаж).

**Повестка дня:**

**1. О доизбрании члена Наблюдательного совета до установленного Уставом ОАО «Белхозторг» количественного состава и утверждение нового состава Наблюдательного совета.**

**2. О досрочном прекращении полномочий члена ревизионной комиссии ОАО «Белхозторг» Крыловской Ирины Владимировны.**

**3. О доизбрании члена ревизионной комиссии до установленного Уставом ОАО «Белхозторг» количественного состава.**

**4. О внесении изменений и дополнений в Устав ОАО «Белхозторг». Утверждение Устава в новой редакции.**

**С информацией, подлежащей рассмотрению на внеочередном общем собрании акционеров, можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Платонова 34, 4-й этаж.**

**Регистрация участников собрания состоится 10 ноября 2016 года с 10.00 до 10.55 по месту проведения собрания. Дата составления списка акционеров 28 октября 2016 года.**

**Для регистрации при себе иметь:**

**– акционеру Общества – документ, удостоверяющий личность;**

**– представителю акционера Общества – доверенность и документ, удостоверяющий личность.**

УНП 100230626

**Наблюдательный совет ОАО «Белхозторг»**

■ Ёсць пытанне

# СТУДЭНТЫ НА РОДАХ — умяшанне ў прыватнае жыццё ці норма?

**Далёка не кожная жанчына ўзрадуецца навіне: на вашых родах будзе прысутнічаць група студэнтаў. Як паказвае практыка і водгукі на форумах маладых матулек, калі парадзіху папярэдзілі пра хуткую «недарэчнасць» — ужо нядрэнна. Але ж ці маюць жанчыны права абараніць сябе ад процьмы лішніх вачэй у настолькі інтымны момант, калі гэта пярэчыць іх жыццёвым каштоўнасцям? Як можа адбіцца прысутнасць вялікай колькасці незнаёмых людзей у радзільні на здароўі будучай матулі? Як, у сваю чаргу, без практыкі вучыцца медыкам-пачаткоўцам, каб стаць выдатнымі спецыялістамі? Карэспандэнт «Звязды» выслухала рознабаковыя меркаванні па гэтых пытаннях і прыняла аптымальны варыянт вырашэння праблемы.**



Фота: Jean-Paul Chassenet / Media for Medical / UIG

**Лізавета Нарушыс, 20 гадоў, спартыўны трэнер:** «Я на шостым месяцы і катэгарычна супраць прысутнасці студэнтаў на сваіх родах. У такі адказны момант не хочацца, каб за мной назірала процьма зацікаўленых вачэй. Гэта, зразумела, справа прыватная. Многія, ведаю, згаджаюцца на такое. Канешне, студэнтам трэба вучыцца, гэта не пярэчыць закону, але абавязкова загадзя трэба гэтае пытанне ўзгадніць з парадзіхай. Асабіста я буду нараджаць па платным кантракце, каб нікто не замінаў і не прысутнічаў».

**Паліна Міцічава, 24 гады, індывідуальны прадпрымальнік:** «У мяне на родах прысутнічалі студэнты. І хачу сказаць ім вялікі дзякуй! Было вельмі балюча і дзве дзяўчыны-практыканткі вельмі дапамагалі. Адна рабіла мне масаж паясніцы, а другая трымала за руку і казала добрыя словы. Потым я заўважыла за шклом яшчэ чалавек 10—15. Але ў той момант мяне нічога не цікавіла, акрамя болю і дзіцяці. Калі нарадзіла, я заплакала і ўбачыла, што дзяўчаты за шклом таксама пачалі плакаць. Я — ад шчасця, а яны — не ведаю чаму... Дарэчы, роды прайшлі паспяхова, праз гадзіну я ўжо бегала. Нягледзячы на тое, што мяне нікто не папярэдзіў, я вельмі рада, што была такая моцная падтрымка».

**Лізавета Прылажынская, 26 гадоў, урач-эпідэміёлаг:** «У студэнцкія гады я прысутнічала на родах у якасці назіральніцы. Калі сама нараджала дзіця, практыкантаў не было: роды пачаліся позна ўвечары, а студэнты прыходзяць, як правіла, да 17 гадзін. Дарэчы, іх прыводзяць на роды толькі ў тыя радзільні, дзе ёсць кафедра акушэрства і гінекалогіі. Даведацца пра такія ўстановы можна загадзя праз інтэрнэт. Канешне, дактары абавязаныя папярэдзіць парадзіху, аднак дазволу нікто прасіць не будзе. Дзяржава прапануе бясплатную медыцыну, калі кагосьці гэта не задавальняе, то ёсць платныя ўстановы. Да таго ж па сабе ведаю, што студэнтаў выкладчыкі таксама доўга рыхтуюць і настройваюць. Медыкі-пачаткоўцы — людзі з разуменнем, таму ніякіх жартаў, каментарыяў і абмеркаванняў сабе не дазваляюць. Наадварот, усе суперажываюць і з дрыгаценнем назіраюць, а калі з'яўляецца малы, ва ўсіх наварочваюцца слёзы, часам пачынаюць пляскаць у далоні і віншаваць. Уявіце сабе, як цудоўна з'явіцца на свет, калі цябе чакае столькі людзей».

**Сяргей Арабей, студэнт чацвёртага курса Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта:** «Як правіла, жанчына не ведае, што да яе прыйдуць студэнты. Нам выкладчык загадзя гаворыць, каб усе падрыхтавалі адпаведнае адзенне і маскі. Студэнты маюць права толькі назіраць за ўсім, што адбываецца, без аніякіх маніпуляцый. А вось інтэрны (дыпламаваныя спецыялісты, якія павінны набірацца практычнага вопыту на працягу года) могуць прымаць роды пад наглядам дактароў ці дапамагаць акушэру. Як будучы спецыяліст у галіне аховы здароўя і як будучы тата я атрымаў найкаштоўнейшы вопыт».

**Ірына Лашко, урач анестэзіёлаг-рэаніматолаг у клінічнай радзільні:** «Трэба разумець, што калі ўстанова аховы здароўя мае статус «клінічнай», то на яе базе працуюць супрацоўнікі кафедраў і ажыццяўляецца навучальны працэс. Прафесары кансультуюць пацыентаў у складаных сітуацыях і, як выкладчыкі, не могуць пазбавіць студэнтаў магчымасці вучыцца. Гэтыя кансультацыі і клінічныя выпадкі запамінаюцца значна лепш, чым апісаныя ў падручніках. На практыцы часцей за ўсё жанчынам настолькі балюча, што яны не зважаюць на старонніх людзей. Абурэнне пачынаецца пасля родаў, аднак пры гэтым усе хочуць атрымаць адукаваных і надзейных спецыялістаў. Студэнтам важна ўбачыць працэс на практыцы, бо падручнікі, лялькі і відэа — гэта менш эфектыўна».

**Нэлі Ксяневіч, псіхолаг:** «Нараджэнне дзіцяці — гэта вельмі адказны, інтымны і досыць небяспечны працэс. Зразумела, што студэнтам трэба вучыцца. Але, лічу, прысутнасць медпачаткоўцаў абавязкова трэба ўзгадніць з парадзіхай. Жанчына падчас родаў не толькі адчувае боль, але і агаляецца ў інтымных месцах, і таму вельмі непрыстойна схаваць ад яе факт візіту незнаёмых людзей. Роды з'яўляюцца вялікім выпрабаваннем, і, каб праходзіць яго пры іншых людзях, трэба валодаць мужнасцю. Пры непапярэджанні можа паўстаць шмат непажаданых псіхалагічных наступстваў — аж да адкладання непрыемнага моманту на падсвядомасці і знікнення сексуальнай цягі. Калі студэнтаў настройваюць на тое, што гэта нешта асаблівае, што з'яўляецца новае жыццё, калі ёсць належнае стаўленне, то гэта велізарны плюс».

**Пытанне аб папярэджанні парадзіхі пра прысутнасць медыкаў-пачаткоўцаў сёння вырашаецца хутчэй на этычным, чым на заканадаўчым узроўні. Але згодна з артыкулам 41 Закона «Аб ахове здароўя» пацыент мае права на паважлівае і гуманнае стаўленне з боку медыцынскіх работнікаў. А значыць, будучая матуля можа запатрабаваць вывесці студэнтаў з палаты, калі гэта пярэчыць яе жыццёвым поглядам і зневажае іх.**

**Вераніка УЛАСЕВІЧ.**
*veronika.ulasevich@mail.ru*

■ Бабуля, пачытай!

# УЮНЫ



Шурка і Мацвей — сярэдні Дарынчын брат — пад вечар збіраюцца ставіць на ноч кашы на ўюноў. Уюны Дарынка любіць у розным выглядзе: у юшцы, смажаных на свіным тлушчы, вэнджаных, сушаных. Яны не пераводзяцца ў сям'і ўвесь год: у скрыні на зіму захоўваецца поўная фанерная дзежачка сухіх, невялічкіх і паламаных — «для сябе». Зімой іх можна есці замест зярнят. За печчу на цвіках вісяць цэлыя нізкі-вязанкі адборных — «для продажу» на базары ў Хвойнічку або ў самім Гомелі. Вэнджаныя, з-за таго што з імі прыходзіцца даўжэй валакіціцца пры прыгатаванні, лічацца далікатэсам і прызначаюцца «для гасцінцаў» далёкай радні, «начальству» і для святочных сталоў. Яны хаваюцца далей з вачэй — абы іх не мазоліць. Са свежых варыцца юшка, а яшчэ яны смажацца на самай вялікай патэльні і падаюцца да вялікай місы дранікаў або бульбы-салонікаў на снеданне. Пасля такога сняданку ўся сям'я абпіваецца вадой. Дакладней, хто чым: хто малаком салодкім і кіслым, хто ўзварам з дзікіх яблыкаў і груш, а хто вадой з вядра на кухні.

Маці кажа, што ў тых, хто спажывае ўюны, заўсёды будуць моцныя косці. Браты ўжо колькі разоў скакалі з платоў, дрэў, нават з дахаў суседскіх і адрыны і нічога сабе не ламалі. Значыць маці кажа праўду — сухія ўюны ўзімку, якія маці насушвала ў печы на бляхах пра запас, «трушчыліся» толькі так, у другіх выглядах — таксама.

Мяса ўюноў ружаватае, мяккае, тлустае і на смак саладкаватае. Каб рыба не адавала ціній, яе вытрушвалі з палатнянай торбы ў вялікую міску і маці добра пасыпала балотнае багацце шэрай соллю. Потым хлопцы станавіліся вакол той міскі, а разам з імі і Дарынка, і глядзелі, як уюны мыюцца-чысцяцца. Яна ўжо добра ведала, што ў адрозненне ад іншай рыбы, якую хлопцы прыносілі з вялікай канавы з праточнай вадой, уюны нават ухапіць у руку цяжка — такія яны коўзкія і вёрткія, не тое каб пачысціць іх луску, якой, дарэчы, на іх цяжка было ўгледзець. У солі ж уюны пачыналі круціцца-вярцецца, а самыя пруткія дык ажно выскоквалі з міскі. З крыкам і гвалтам усе кідаліся іх падбіраць і закідваць назад. Тады ўюны ў руках пачыналі пішчаць — спускаліся заглынутае паветра. Праз некаторы час яны самі какышчаліся ў солі і станавіліся светлымі.

Аднойчы браты, як звычайна, вытраслі з торбы свой здабытак і пайшлі на двор (павесіць на плот кашы для прасушкі). Тым часам маці выйшла да каморы па соль, а Дарынка з цікавасцю разглядала ў місцы ўюноў. Яны былі, як і заўсёды — з жоўта-бурымі ў чорных крапліністых спінамі і такога ж колеру плаўнікамі, ды яшчэ з шырокімі чорнымі падоўжнымі палосамі пасярэдзіне, а па бакавінах значна танчэйшымі. Жываты ў рыбінак былі жоўтымі і трохі чырванаватымі. Калі з бляшанкай солі вярнулася маці і жменяй пасыпала ўюноў, а сама адышла да печы, у місцы пачалася знаёмая ўюновая свістапляска. І тут Дарынка раптам закрычала з усяе сілы, перапужаўшы і маці, і братоў, якія паказаліся са двара:

— Паглядзіце, што я ўбачыла. Вунь ён, вунь!

— Хто там такі вунь? Чаго ты крычыш? Мо цябе хто ўкусіў? — кінуліся да малой родныя.

А Дарынка аж захліпалася ад пабачанага: сярод жывой жоўта-бура-чорнай масы ўюноў круціўся белы іх сабрат-альбінос. Такое дзіва ўсе бычылі ўпершыню. Хлопцы, каб дагадзіць сваёй малодшай сястры, якую ўсе ў сям'і апякалі, уладавалі ёй маленькае балотца: прынеслі ў цэбры мокрай травы з граззю і апусцілі туды белага ўюна. Альбінос на радасць Дарынцы жыў там некалькі дзён, а яна яго лавіла і не магла ўхапіць — такі слізкі і вёрткі ён быў. Потым і яго прыйшлося адправіць на бляху сушыцца. Дарынка не дазволіла нікому яго з'есці. Яна схавала ўюнка ў скрыначку з-пад ручкі-самапіскі і паказвала-хвалілася сваім скарбам закадычным сяброўкам. Да таго часу, пакуль той не зламаўся ад цягання, як заязначыў Шурка, «туды-сюды». Прыйшлося яго з'есці.

— Вазьміце мяне з сабой, я таксама хачу лавіць уюноў, — румзае Дарынка, не адстаючы ад братоў.

— Яшчэ чаго ўздумала — ісці далёка да тых балотцаў, дзе яны водзяцца, ды яшчэ й цераз вялікае балота на купінах скакаць. А цябе што — на карку перці? — Шурка ўдае сябе за вялікага.

— Ага, табе добранька, цябе Мацейка бярэ з сабой, а мне дык сядзі дома, — канючыць зноў Дарынка.

— Запрычытала, закудактала, — зняважліва зноў адзываецца малодшы з братоў — яе закадычны сябар па розных гульнях і напарнік-танцор па суботніх танцах-скоках, калі ў іх хаце збіраюцца на вячоркі суседзі па вуліцы.

— Не плач, Дарка, мы табе яек з балот прынясём: качыных, чыбісавых і пекуравых. А мо зайчыка зловім у лесе. А яшчэ я табе пакіну некалькі самых маленькіх уюнкоў на тваю патэльнечку, а можа зловім табе яшчэ белага ўюнца. Так, мама? Забярыце Дарынку, а то яна не дае нам сабрацца, — звяртаецца Мацвей да маці і тут жа да старэйшага брата Сцяпана:

— А ты на старым месцы кашы ставіў?

— На старым, на старым! Давай, ідзіце ўжо, мне сачыненне напісаць трэба, а вы тут гвалт улаштавалі, засярodзіцца не даяце, — азываецца з залы Сцяпан.

— Хлопцы, не забірайце з гнёздаў усе яйкі, на развод пакідайце. Не забылі? — звяртаецца-напамінае маці да сыноў. Тыя ківаюць галовамі — не забылі. — Ды прыкмецьце, як уюны сябе паводзяць, бо я заўтра збіраюся жлукту ставіць бялізну мыць. Мацвей на чарговы наказ маці толькі ківае галавой, а Шурка адказвае: — Добра, мама, глянем.

Нават Дарынцы зразумела, аб чым размова: уюны ж прадказваюць надвор'е. Калі яны з'яўляюцца на паверхні, то гэта азначае, што трэба чакаць навальніцу. А жлукту ставіць пад навальніцу — дурная справа.

Праз акно Дарынка бачыць, як браты закідваюць за плечы плеценыя з ракіты ў выглядзе конусаў кашы. Яны ўстаўлены адзін у аднаго і ў іх няма вяршынь, бо яны сцяюльныя. Шурка паказваў ёй, як уюны трапляюць у тыя кашы і потым не могуць з іх выбрацца. Браты знікаюць за «агародны» брамкай, і Дарынка злазіць з табурэткі.

**Раіса ДЗЕЙКУН**

■

■ Рэзананс

# ВЫКІНУЦЬ МОЖНА ЎСЁ

**Заўсёды чакаю і чытаю звяздоўскую «Сямейную газету». Падабаюцца яе ўступныя калонкі, даверлівыя размовы з цікавымі людзьмі, гісторыі з фатаграфіямі, «беларусікі»... Але ж адзін артыкул мяне насцярожыў: у нумары за 13 кастрычніка газета пералічыла 15 прадметаў з нечаканымі тэрмінамі прыдатнасці і па сутнасці прапанавала нам, чытачам, кожны квартал выкідваць зубныя шчоткі, кожныя два — хатнія тапачкі, кожны год — расчоскі і парфуму, праз 2-3 гады мяняць падушкі і ручнікі...**

Наконт асобных «прадметаў» з газетай можна пагадзіцца: спецыі і сапраўды страчваюць свой водар, адкрыты перакіс вадароду — лекавыя якасці, а выпечка са старой мукі — смак, аднак іншае...

Да мяне на вяселле, напрыклад, некалі прыязджала родная цётка з Украіны і ў падарунак прывезла вялікую падушку. Для таго каб зрабіць яе, яна сама вырошчвала гусей, сама адбірала пух, шыла навалачку...

Колькі гадоў прайшло, той цётачкі ўжо на свеце няма, а падарунак яе ўсё яшчэ служыць. На гэтай падушцы некалі спалі мы з мужам, потым — нашы дзеці...

Не згодна я выкідваць і свае ручнікі, бо, па-першае, большасць з іх таксама падарункі, па-другое, мы не такія багатыя, а па-трэцяе, дзе логіка? Газета піша, што заводзяцца ў іх нейкія бактэрыі, якія не гінуць ні ў кіпені, ні пад гарачым прасам? Дык давайце тады ўсё павыкідваем, бо дзе гарантыя, што ў шафе тыя бактэрыі з ручніка не «перасяліліся» на прасціны альбо на нашу бялізну?..

Магчыма, я памыляюся, але так аберагаючы свой арганізм ад розных мікробаў і бактэрый, мы распешчваем яго, робім няздольным супрацьстаяць нават самай дробнай небяспецы, якая падпільноўвае нас па-за сценамі дома. І чаго тым самым дамажамся?

**Тамара К.**, *г. Асіповічы.*

***Шаноўныя чытачы, мы ўдзячныя вам за тое, што знаходзіце час і дасылаеце ў «Сямейную пошту» свае водгукі і парады. Шчыра радуемся кожнаму лісту (яны дапамагаюць зразумець, якія тэмы вас хвалююць, і натхняюць на наступныя нумары) і з нецярпеннем чакаем новых***

■ Беларусікі



«НАШАЙ любай дачушцы Маргарытачцы Белавусавай усяго 5 гадоў, а яна ўжо зорка! Умее не толькі спяваць беларускія песні, але і іграць на піяніна і трашчотках. Уся ў нашу прабабулю, якая была выдатная пявуння, любіла танцаваць і ведала абрады. Маргарытка на сцэне з 4 гадоў, з задавальненнем выступае ў складзе магілёўскага вакальнага ансамбля «Скарбніца», які дзейнічае пры аддзяленні харавых спеваў Магілёўскай дзіцячай школы мастацтваў №3 імя Салдатава. Калектыў з захапленнем прымаюць на ўсіх гарадскіх святах, ён неаднаразова быў пераможцам конкурсаў у Беларусі, Расіі і Польшчы. У першую чаргу гэта, канешне, заслуга кіраўніка ансамбля Алены Багданавай, якая размаўляе з дзецьмі на адной мове, у гульнявой форме расказвае ім пра народныя традыцыі. У іх ёсць нумар Калядкі, калі нашы малыя разам са старэйшымі дзецьмі ходзяць па сцэне з казой. Ён настолькі яркі і эмацыянальны, што ахно самой хочацца далучыцца. Па дачушцы бачу, як ёй усё гэта падабаецца. А яшчэ ў дзіцячым садку, які яна наведвае, кожны чацвер ладзяць дні беларускай мовы. І мы дома таксама вітаемся па-беларуску».

***Мамы і таты, бабулі і дзядулі! Шчыра запрашаем вас прыняць удзел у конкурсе «Беларусікі». Дасылайце здымкі вашых дачушак і сыночкаў, унучкаў і ўнучачак, а можа, нават і праўнукаў (з невялічкім, 4-5 сказаў, аповедам пра фота) на адрас «Звязды». Але адна ўмова — каб, зірнуўшы на фота, адразу ж было зразумела, што гэта «беларусік». Арыгінальнасць і творчы падыход вітаецца! Аднаго з беларусікаў, якога мы ўбачым на здымках, чакае прыз***

■ Дзелімся досведам

## ЯК ПАЗБАВІЦЦА АД ПРЫШЧОЎ



Да...



...і пасля.

У мяне з 13 гадоў былі прышчы. Як я толькі ні пазбаўлялася ад іх — нічога не дапамагала, пакуль не з'ездзіла ў госці да сяброўкі. Яе тата параіў выдатную рэч, называецца «алуніт» — гэты камень наогул лічыцца дэзадарантам, але яго можна выкарыстоўваць у любых мэтах і нават паласкаць рот ад карыесу (папярэдне апусціўшы ў шклянку з халоднай вадой на 30 секунд).

Ад прышчоў я пазбавілася за 2 месяцы. З таго часу, калі і выскачыць адзін, я яго намажу алунітам — і ўсё. Прадаецца ў аптэках, але не ва ўсіх. Па-іншаму завецца «квасцовы камень». Галоўнае, каб на этыкетцы ў складзе не было ніякіх дадаткаў. Выглядае, як звычайны дэзадарант, але ўнутры камень (а не шарык), які круціцца. Мазаць трэба па чыстым твары, папярэдне акунуўшы алуніт у халодную ваду. Я рабіла так: з раніцы твар добранька ачышчала дзягцярным мылам (цёплай вадой), потым мыла халоднай вадой, падстаўляла камень пад халодны струмень і мазала ім увесь твар. Вечарам — гэтак жа.

**Марына ШЫЛОЎСКАЯ**

## Лічылкі




Кацілася торба
З высокага горба,
А ў той торбе
Хлеб, пшаніца.
З кім жадаеш
Ты дзяліцца?

☺☺☺

Раз, два, тры, чатыры,
Кошку грамаце вучылі:
Не чытаць, не пісаць,
А за мышкамі скакаць.

☺☺☺

Хадзіў буська па балоту,
Ён шукаў сабе работу.
Шукаў, шукаў,
не знайшоў
І заплакаў дый пайшоў.

☺☺☺

Раз, два, тры, чатыры —
Зайчык вушы
натапырыў.

Ідзе з лесу воўк, воўк
І зубамі: шчоўк, шчоўк.

Мы схаваемся ў кусты:
Зайка, я, і ты, і ты.

Ты ж, ваўчына, пачакай,
Як схаваемся — шукай.

**(Васіль Вітка).**

☺☺☺

**Верш, дзе ўсё наадварот**

Граблі сенам дзед грабе,
А трава кароў скубе,
З-пад сабакі брэша плот,
На гурках расце гарод.

Парсючка фасоля
зрыла,
Хмарку сонейка
закрыла,
Праз раўчук асфальт
пацёк...
Кот ад мышкі
ледзь уцёк!
Лапку поўсткай расчасаў
І для дзетак напісаў
Верш,
дзе ўсё наадварот...
Падпісаўся:
Вот-Куркот.

**(Генадзь Аўласенка).**

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

### ПАКАШТУЙЦЕ!

## ЦЭПЕЛІНЫ

**Спатрэбіцца:** *300 г фаршу са свініны; 100 г сала; 2-3 вараныя бульбіны (у мундзірах); 4 сырыя бульбіны, жменя сухіх грыбоў; 2 цыбуліны (адна сярэдняя і адна невялічкая); паўшклянкі смятаны; соль, чорны перац; маяран.*



Грыбы заліць шклянкай халоднай вады і пакінуць замочвацца на гадзіну-дзве. Большую цыбуліну дробна нарэзаць. Сала нарэзаць саломкай 1 см таўшчынёй, вытапіць з яго тлушч (да стану сквaрак) на сярэднім агні. Скваркі выняць і адкласці, у тлушчы абсмажыць 2/3 цыбуліны з грыбамі, нарэзанымі дробна (ваду з-пад грыбоў пакінуць). Фарш змяшаць з абсмажанымі грыбамі і цыбуляй, дадаць соль, перац, маяран. Бульбу (вараную і сырую) пачысціць і надраць на дробнай тарцы. Да сырой бульбы, каб яна не цямнела, дадаць надзёртую маленькую цыбуліну. З бульбянай масы трэба адціснуць сок праз дапамозе марлі. Даць яму крыху адстаяцца і сабраць з дна крухмал. Дадаць яго да бульбы, усё добра перамяшаць, пасаліць. Потым трэба зляпіць цэпеліны — бульбяныя «зразы» з начынкай з фаршу. Іх вараць порцыямі ў падсоленай кіпячай вадзе пры ціхім кіпенні 15—20 хвілін. У гэты час гатуюць соус: цыбулю, якая засталася, смажаць у тлушчы да маккасці, уліваюць туды ваду з-пад грыбоў, напалову выпарваюць на малым агні, дадаюць смятану, перчаць, соляць, прагрaваюць. Цэпеліны дастаюць з кіпню, шчодра паліваюць соусам, пры жаданні наверх кладуць скваркі і адразу падаюць.

### ЁСЦЬ ІДЭЯ!

**Плецены кошык з кардоннай скрыні**













### ВАРТА ВЕДАЦЬ

**КАБ НЕ АБВЕТРЫЎСЯ СЫР**

Сыр у халадзільніку не перасохне, калі абмажаце бакі кавалачка маслам або маргарынам. Гэта ўтрымае вільгаць.

**КАБ БАНАНЫ ЗАСТАВАЛІСЯ ЖОЎТЫМІ**



Каб адтэрмінаваць утварэнне карычневай мякаці, аддзяляйце банан ад агульнай звязкі прама перад тым, як яго з'есці. У звязцы бананы застаюцца свежымі даўжэй.

**ВЯРНУЦЬ ПРУГКАСЦЬ АГАРОДНІНЕ**

Каб морква, радыска, сельдэрэй і іншая гародніна, якая паляжала ў халадзільніку, зноў стала хрумсткай, кіньце яе ў ледзяную ваду з лустачкай сырой бульбы.

### РАПТАМ СПАТРЭБІЦЦА

**БОЛЬШ СОКУ З ЦЫТРУСАВЫХ**

Непасрэдна перад тым, як выціскаць сок, пакачайце цытрусавыя па стале, крыху прыціскаючы іх да паверхні. Гэта паляпшае аддзяленне вільгаці ад валокнаў.

**ЧЫСТАЯ ПЛІТА БЕЗ ДРАПІН**

Каб адшараваць застылы тлушч з пліты, але пры гэтым не пакінуць драпін, пратрыце праблемныя месцы ватным тампонам са спіртам або гарэлкай.

**АДШАРАВАЦЬ ПАДГАРЭЛУЮ ПАТЭЛЬНЮ**

Каб адчысціць гар з патэльні, пасыпце яе харчовай содай, змяшанай з 4-5 лыжкамі солі, заліце невялікай колькасцю вады і пакіньце на ноч. А раніцай гар лёгка адмыецца.

«АБДЫМКІ МОГУЦЬ ЗРАБІЦЬ ШМАТ ДОБРАГА — АСАБЛІВА ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ» (прынцэса Дзіяна).

Адказная за выпуск Надзея ДРЫНДРОЖЫК.

# ДВА Ў АДНЫМ

## Стары Мінск саступае месца маладому. Як дажываюць свой век сталічныя баракі?

**З кожным годам буйныя будоўлі мяняюць сталічныя вуліцы, і тым не менш у горадзе затаіліся куточкі, у якія варта завітаць, каб даведацца, які быў стары Мінск. Зусім побач са станцыяй метро «Грушаўка» захаваўся цэлы барачны гарадок, з дзясятка дамоў самы малады — 1949 года пабудовы, а «старэнькія» ўзводзіліся яшчэ ў 1936-м.**


Грады — адразу пад вокнамі.

У гэтых двухпавярховых дамках вырасла некалькі пакаленняў. Самыя сталыя насельнікі памятаюць, як яшчэ ў пакоях стаялі печкі, па ваду даводзілася хадзіць да калонкі. Калі падымаешся па старой драўлянай лесвіцы, сапраўды з'яўляецца адчуванне, што пераносішся ў іншы час. Не дзіва, што гэта месца аблюбавалі кіношнікі, сюды яны едуць, каб узнавіць у фільмах савецкую эпоху. Жыхары драўлянага гарадка расказваюць, што тут і «немцы» ў касках па вуліцах хадзілі, і кватэры многія былі задзейнічаны пад здымачныя пляцоўкі.

Побач з дамкамі заўважаю პранумераваныя хлеўчукі (яны выдзяляліся на кожную кватэру), раней там складвалі дровы, у некаторых захаваліся стэлажыкі — зусім як у вёсцы. Кажуць, калісьці былі і такія жыльцы, што трымалі тут свіней.

### «Амаль як у вёсцы»

«Нашы сябры часта зайздросцяць, кажуць, што жывём мы «як у вёсцы». Тут сапраўды добра, шмат зелені, побач сквер. Усе цябе ведаюць, людзі адзін за аднаго гарой, другі раз мы збіраемся шашлычок на вуліцы пасмажыць. Наша сям'я нават шкадуе, што прыйдзецца адсюль з'язджаць», — дзеліцца Ірына Таранава з дома па вуліцы Дзекабрыстаў, 11.


Ірына 42 гады жыве ў драўляным пасёлку.

Сапраўды, тут адчуваеш сябе незвычайна. Гэткае два ў адным. Разумееш, што ты ў горадзе — да метро рукой падаць. А прыладзішся на лавачцы побач з драўляным домам — як у вёску трапіў. Першыя халады яшчэ не сцерлі ўтульную прыгажосць мікраёна: пад вокнамі красуюць дагледжаныя кветнікі, сям-там заўважаю і маленькія агародзікі, па рэштках расліннасці здагадваюся, што сёлета тут збіралі памідоры і гарбузы. А пладовыя дрэвы, якіх багата ў барачным пасёлку, аказваецца, падзелены паміж жыльцамі, і людзі прытрымліваюцца ўмовы, каму дзе збіраць яблыкі. А калі які чужы чалавек раптам завітае сюды і захоча патрэсці яблыню, яго могуць і пагнаць: «Гэты сад не кінуты!» Наогул, заўважаю, што гаспадынькі, якія ў добрае надвор'е выбіраюцца пасядзець перад домам на лавачках, уважліва сочаць за людзьмі. Тут адразу пазнаюць чужога. А як жа інакш, калі кожны дом — на 8 кватэр.

— Ваш дом пабудаваны ў 1936 годзе! Няўжо ў ім нічога не развальваецца? — цікаўлюся ў Ірыны.

— Ён вельмі моцны, малайцы тыя, хто яго будаваў. У пакоях цёпла, стаіць кацёл, і мы самі яго рэгулюем. Хіба што ванны няма. Праўда, з таго часу побач пачалася будоўля, мы жывём як на вулкане. Калі «грыміць», пабелка сыплецца кавалкамі. І не залепіш яе, бо трасе пастаянна.

Дом Ірыны — адзін з першых прэтэндэнтаў на высяленне: за некалькі крокаў ад яго — агароджа, за якой узводзіцца чарговая высотка. Яшчэ адзін барак па суседстве з гэтай новабудоўляй ужо пустуе.

### Пакінутыя людзі?

— Нам абяцалі, што, калі будзе будавацца метро, такіх старых дамоў не застанецца. А мы ўсё жывём... Павінен жа быць нейкі план, жыльцам трэба ведаць хаця б прыблізна, калі дом знясуць. І мы ніяк не можам гэтага дабіцца, — заўважае Лілія Смірнова з дома па вуліцы Дзекабрыстаў, 16.

У пашпартах на некаторых бараках у графе «наступны рамонт» пазначана «пад знос», і калі на пад'ездах заўважаю рэкламныя аб'яўкі накшталт таго, што «ў жыхароў вашага дома ёсць унікальная магчымасць са скідкай зрабіць нацяжныя столі і паставіць пластыкавыя вокны», становіцца смешна. Але мая суразмоўніца мяркуе інакш: «Я вось шпалеры купіла, хачу кухню пакleіць. Хоць самой будзе прыемна пасядзець, кавы папіць». А можа, яна мае рацыю? Калі справа з высяленнем зацягнецца, не жыць жа людзям у няўтульных пакоях. За той час, як вядуцца размовы аб знішчэнні баракаў (а гэта ўжо больш за дзясятак гадоў), людзі маглі не раз змяніць абстаноўку.

...А дамы паціху рассыпаюцца. Месцамі «плачуць» дахі, прагніваюць дошкі. Па «ранах» можна вывучаць будову дома — тынкоўка тут пакладзена на дранку, месцамі сыплюцца трэскі. Праблемы з каналізацыяй, праводкай, а яшчэ трэба змагацца з мышамі і пацукамі.

— На ўсе заўвагі ў камунальшчыкаў адказ: дамы пад знос, — скардзіцца Лілія Рыгораўна. Хаця ў нас ідуць адлічэнні на капітальны і бягучы рамонт. Нават траву прыходзіць касіць, толькі калі патэлефануем, што вялікая вырасла. Лямпачкі самі па чарзе купляем, дзверы ў пад'езд не зачыняюцца, нават ручкі няма. Калі ўзнікаюць праблемы з каналізацыяй, выклікаем аварыйку. Вакол усё перакапана. Дарогі разбітыя. Калі ідуць дажджы, адсюль не выбрацца. Раней была прамая сцежка да прыпынку, цяпер забудоўшчык усё перакрыў, трэба рабіць вялікі круг, выходзіць на вуліцу Папаніна. Добра, калі чалавек здаровы, а такім, як я, столькі прайсці цяжка. Я старыя чалавек, часта выклікаю хуткую дапамогу, а як ёй праехаць? Колькі гадоў таму ў суседнім доме быў пажар, машына МНС не магла праехаць — захрасла, бо ўсё было разварочана. Тое месца цяпер засыпалі жвірам.

Новабудоўля паступова сціроае аблічча старога драўлянага горада, зносяцца не толькі баракі — ламаецца стары ўклад. Можа, невыпадкова многія жыльцы баракаў, калі пачынаюць прыгадваць мінулае, з цеплынёй заўважаюць, што раней «жылі як у раі». Так і Лілія Рыгораўна: «Тут такі прыгожы быў сквер, дзе гулялі з малымі. Колькі дрэў знеслі ўздоўж вуліцы Дзекабрыстаў — жах! Была тут свая лазня — выкупілі прыватнікі. І кінатэатр таксама. Усё прадаецца...»

### Элітны дом

Барачны пасёлак працягваецца на вуліцы Папаніна. Толькі з першага позірку дамы падаюцца аднолькавымі. У адзін зазірнула — брудныя, перапэцканыя сцены. Ды і стаіць гэты дом, як на мыліцах, — каб столь з верхняга паверха не правалілася, яе падпірае бэлька. Але ёсць і такія дамкі, якія язык не паварочваецца назваць драхлымі. Спыняюся ў дагледжаным дворыку, заходжу ў пад'езд — чысценька, і вока перш не на «маршчынах»-драпінах на століі сценах спыняецца, а на тым, як гаспадары паспрабавалі ўпрыгожыць агульны калідор, — у справу пайшлі малюнкі, старая мэбля, цацкі.

Між іншым, дом гэты мае сваю гісторыю. Некалі ён быў элітным. Відаць, і сёння жыхары яго стараюцца «трымаць марку». Калі суседзі хадзілі па ваду да калонкі, а прыбіральні мелі на двары, у гэтым доме былі ўсе выгоды. З усіх драўляных дамоў тут была самая добрая планіроўка: ізаляваныя пакоі, шыкоўныя пярэднія, вялікія кухні, асобны туалет і ванны пакой. І па метражы выйгравалі ў многіх тагачасных сталічных будынкаў. Мяркуйце самі: двушка тут была ў 57 «квадратаў», кухня ў 10,5 квадратнага метра. Перагародкі драўляныя, суседзяў не чуваць — катэдж, ды і толькі... У 1980—1981 гадах быў зроблены апошні капітальны рамонт, выкінулі кафельныя печкі-ляжанкі, пусцілі прыродны газ, паставілі катлы і калонкі. І з тых часоў пра дом быццам забыліся, бо сёння ён не пазбаўлены тых жа праблем, што і баракі па суседстве.

«Вы толькі не думайце, што мы за старое рукамі і нагамі трымаемся — людзі даўно настроены на выезд. Ужо ёсць рашэнне, што мы ідзём на знос, і нас больш цікавіць, што дадуць і куды выселяць. А калі знесці і дом, і хлявы — тут можна не адну высотку паставіць», — заўважаюць гаспадары.

Стары Мінск саступае месца маладому...

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**
*dziadziula@zviazda.by*

### ТЫМ ЧАСАМ

*У адміністрацыі Маскоўскага раёна горада Мінска карэспандэнту паведамілі, што забудовай тэрыторыі па вуліцы Дзекабрыстаў, дзе размяшчаюцца баракі, займаецца кампанія «Датч Стар». Мы звязаліся з забудоўшчыкам, каб высветліць, як будзе вырашацца лёс старых будынкаў. Такім чынам, людзям не прыйдзецца доўга сядзець на чамаданах. У самы бліжэйшы час на месцы старога драўлянага жылля з'явіцца вялікі сучасны будынак. На 30 лістапада намечана здача 4—5 секцый, на 2018 год запланавана будаўніцтва 6 і 7 секцый. Усяго ж новы жылы комплекс будзе складацца з 11 секцый.*

*— Мы непасрэдна падышлі да пытання зносу дваццатага барака, людзі з яго ўжо выселены, адпаведна далей будуць зносіцца 18 і 16 дамы. Пасля гэтая тэрыторыя будзе выкарыстоўвацца для развіцця будаўнічай пляцоўкі на час узвядзення астатніх секцый. А пасля завяршэння будаўніцтва яна будзе добраўпарадкавана і прыведзена ў вельмі прывабны выгляд, — паведаміў вядучы інжынер тэхнагляду Мікалай СЯРЖАНТ. Скверык, які так падабаецца жыхарам барачнага пасёлка, захаваецца, ніякіх пабудоў на яго тэрыторыі не запланавана. Па словах Мікалая Сяржанта, трымаецца на кантролі і «дарожнае» пытанне. Днямі была зроблена часовая пад'язная дарога да баракаў па вуліцы Дзекабрыстаў.*

*Не забудуцца і пра праблемы пешаходаў. На тэрыторыі сквера захавалася старая пешаходная асфальтавая дарожка. Плануецца зрабіць прымыканне яе да асноўнага існуючага праезда. Перасунецца агароджа, будзе пакладзены кабель, засыпана траншэя і з'явіцца добры праход для пешаходаў.*

■ Экслібрыс «Звязды»

# МІСІЯ: ЗНАЙСЦІ ЗОРКУ



**Першае каханне: аповесці і апавяданні. — Мінск: Мастацкая літаратура, 2016. — 479 с.**

**Пабачыўшы на паліцах кнігарняў і бібліятэк гэтае выданне, многія, безумоўна, узрадуюцца. Гаворка перш за ўсё пра вучняў і школьных настаўнікаў беларускай літаратуры. Кніга, з якой пачалася выдавецкая серыя «Пазакласнае чытанне» (і назва цалкам адпавядае яе прызначэнню), сапраўды дапаможа ў вучобе. Пазбавіць неабходнасці доўга корпацца ў зборах твораў ды томіках выбранага асобных аўтараў, насіць у сумцы цяжкія таміны, з якіх «карысныя» і актуальныя ў пэўны момант навучання — толькі некалькі дзясяткаў старонак, і дасць магчымасць атрымаць усё і адразу. Гэта вельмі ўдалы падыход нават з пункту гледжання маркетынгу: чытачу патрэбна даваць усё і адразу, «хапаць» яго ўвагу яркасцю, універсальнасцю і вычарпальнасцю зместу.**

Таму і кніга «Першае каханне» мае на мэце ў першую чаргу прывабіць школьніка творамі нашых класікаў, а яе назва гаворыць сама за сябе: пад увагу ўкладальніцы зборніка, вядомай паэткі Аксаны Спрынчан, трапляюць у асноўным празаічныя творы, што расказваюць пра самыя першыя сімпатыі школьнікаў да сваіх сяброўак-аднакласніц ці хаця б даюць тонкі намёк, што пачуццё вось-вось народзіцца. Ну і ў адпаведнасці з задумкай серыі, гэты зборнік пазнаёміць з творамі беларускіх класікаў, якія прапануюцца школьнікам для самастойнага пазакласнага чытання. Як кажуць, выданне дапамагае сумясціць прыемнае з карысным.

І калі для школьнікаў гэтую кнігу можна назваць выданнем актуальным і своечасовым, то нельга сцвярджаць, што для дарослых яно не мае ніякіх прывабных рыс. Тут працуе іншы падыход — настальгічны. Знаёмыя з дзяцінства ці юнацтва творы нібыта пераносяць нас у часе і дазваляюць сустрэцца з сабой — тымі, якімі былі дзесяць-пятнаццаць-дваццаць гадоў таму. Аповесць Міхася Лынькова «Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў» і апавяданне «Васількі» (ці не пісалі мы паводле яго дыктоўку на ўроках беларускай мовы?), рамантычна-шчымлівая «Насцечка» Кузьмы Чорнага і незвычайная «Вайна ля Цітавай копанкі» Івана Навуменкі... Гэтыя творы — як старыя сябры, якіх даўно не бачыў, якія згубіліся ў часе, але ты заўсёды ведаеш, што яны цябе чакаюць. У любы момант можна вярнуцца, завітаць у госці да іх і разам з тым — да сябе.

Дарэчы, вельмі карысным будзе гэтае выданне і для пісьменнікаў-пачаткоўцаў, якія спрабуюць свае сілы ў жанры кароткага апавядання ці аповесці. Бо ў гэтых тэкстах выяўлены фактычна ўсе рысы, за якія прынята хваліць айчынную класіку. Не, гэта не традыцыйныя звароты да тэм вайны і вёскі. Гэта неймаверная дэталёвасць апісанняў, багацце мовы (гэта тычыцца перадусім назваў раслін, птушак, разнастайнасці эпітэтаў і метафар — тых элементаў, якія часам губляюцца ў творах сучаснікаў), дакладная перадача пачуццяў герояў. Таксама ў творах са зборнікаў не адчуваецца страху аўтараў падаць наіўнымі, яны ўмеюць нават банальныя сюжэты расказаць цікава і захапляльна.

Так, не пакіне раўнадушнымі падборка апавяданняў Уладзіміра Аляхновіча. Гэта кароткая, але вельмі змястоўная проза, за якой хаваецца і мудрасць жыцця, і назіральнасць, і ўменне аўтара трымаць інтрыгу да апошняга моманту. Героі гэтых твораў — вучні 5—8 класаў, якія толькі пачынаюць самастойна спасцігаць свет і асэнсоўваць сваё месца ў ім. Нехта дзеля першага кахання не баіцца пераходзіць раку падчас крыгаходу і атрымаць запаленне лёгкіх, а нехта з задавальненнем клапоціцца пра пару лебедзяў, што засталіся зімаваць на лясным возеры. Хтосьці смела рушыць за некалькі кіламетраў, каб адшукаць зорку, што ўпала з неба яшчэ некалькі дзесяцігоддзяў таму. Часам чытач нават не вагаецца: такія смелыя шукальнікі-даследчыкі сваю зорку абавязкова знойдуць, пераадолеўшы ўсе перашкоды на шляху.

Хай тая зорка нават будзе проста сімвалічнай — радасцю ад спаткання з каханай, блізкага знаёмства са светам прыроды ці проста вяртання любімай бабулі шчасця жыць — задавальненне ад сустрэчы з марай ад гэтага меншым не стане.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*

Минский городской центр недвижимости

## Извещение о проведении электронных торгов

**Коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости» 28 ноября 2016 г. в 11.30 на электронной торговой площадке «МИНСК-НЕДВИЖИМОСТЬ» (http://minskestate.by) проводит электронные торги по продаже права заключения договоров аренды земельных участков в г. Минске**

**Предмет электронных торгов: право заключения договора аренды земельного участка сроком на 5 лет**

| № предмета аукциона | Месторасположение земельного участка | Кадастровый номер земельного участка | Площадь, га | Целевое назначение земельного участка/ назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества | Начальная цена предмета аукциона, рублей образца 2009 года/ рублей образца 2000 года | Сумма задатка, рублей образца 2009 года/рублей образца 2000 года | Расходы на подготовку документации для проведения аукциона, рублей образца 2009 года/ рублей образца 2000 года | Отдельные условия, предусмотренные в решении Мингорисполкома об изъятии земельного участка для проведения аукциона и иные условия аукциона |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 1 | г. Минск ул. Хмаринская | 500000000008006389 | 1,1992 | Для строительства объекта сервисного обслуживания с автосалоном/ земельный участок для размещения объектов иного назначения | 270 627,16/ 2 706 271 600 | 40 600,00/ 406 000 000 | 6 659,96/ 66 599 602 | Проектирование и строительство объекта осуществлять со следующими параметрами – состав объекта: автосалон с выставочной и клиентской зоной – 700 кв. м; зона СТО и мойки 2 500 кв. м; зона административных помещений 1 800 кв. м, стоянка для автомобилей (в соответствии с нормативной потребностью) не менее 50 м/м |

**Продавец:** Минский городской исполнительный комитет, пр-т Независимости, 8, 220030, г. Минск, сайт: www.minsk.gov.by

**Организатор электронных торгов и оператор электронной торговой площадки:** Коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к.10, 220030, г. Минск, телефоны: (017) 2261672, 327-40-22, сайт: www.mgcn.by.

**Порядок проведения электронных торгов:** электронные торги проводятся в соответствии с **регламентом** информационной торговой системы ЭТП «МИНСК-НЕДВИЖИМОСТЬ» (далее – Регламент) с соблюдением требований Положения о порядке проведения электронных торгов по продаже государственного имущества, включая земельные участки, права заключения договора аренды государственного имущества, в том числе земельных участков, утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 №608 (далее – Положение).

**Для участия в электронных торгах необходимо** ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на сайте ЭТП по электронному адресу: **http://minskestate.by**, пройти аккредитацию на ЭТП, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП, а также оплатить оператору ЭТП компьютерные услуги согласно прейскуранту, размещенному на сайте ЭТП.

**Задаток** перечисляется на расчетный счет № 3012104971019 в Региональной Дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, 220035 г. Минск, просп. Машерова, д. 80, УНП 190398583, получатель – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости» (задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению) не позже срока окончания приема документов на участие в электронных торгах – **22.11.2016 г.**

Дата и время начала проведения электронных торгов: **28 ноября 2016 года в 11.30** (по времени на сервере ЭТП «МИНСК-НЕДВИЖИМОСТЬ»).

Победитель электронных торгов либо претендент на покупку, выразивший согласие на приобретение земельного участка по начальной цене, увеличенной на 5%, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах электронных торгов либо признания торгов несостоявшимися, до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка обязан:

– внести плату за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения);

– возместить Минскому горисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;

– возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения;

– выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона.

